ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПАНЯДЗЕЛАК, 11 ЛІПЕНЯ 1938 г. № 38 (380)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПРАВАДЫР НАРОДАЎ, АРГАНІЗАТАР БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ—ВЯЛІКІ СТАЛІН!

НЯХАЙ ЖЫВЕ 18-годдзе ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ!



18-ГОДДЗЕ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

18 год таму назад беларускі народ, пры братняй дапамозе іншых народаў нашай радзімы і ў першую чаргу магутнага рускага народа, выгнаў белапольскую шляхту з сваёй роднай зямлі. 11 ліпеня 1920 года над Менскам быў узнят чырвоны сцяг. З таго часу гэты сцяг на працягу восемнаццаці год пераможна ўзвіваецца над краінай, натхняючы заходне-беларускіх братоў, якія стогнуць пад белапольскай пятой, на барацьбу за соцыялістычную рэвалюцыю, за соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

На працягу многіх вякоў тры вялікія славянскія народы—рускі, украінскі і беларускі змагаліся супроць нямецкіх і польскіх заваявальнікаў. На працягу многіх вякоў польскія магнаты, паны і ксяндзы імкнуліся заняволіць нашы народы, патаптаць нашы палі, знішчыць нашу культуру і здзекавацца з нашай мовы. Шмат гістарычных урокаў было дадзена славянскімі народамі праклятай польскай шляхце, нязменна народ паўставаў супроць польскіх захватчыкаў і гвалтаўнікоў і выганяў іх з сваёй зямлі. Так было ў 1612 годзе, так было праз тры вякі і ў 1920 годзе.

Геніі рэволюцыі Ленін і Сталін, комуністычная партыя і совецкі ўрад на разгром акупацыйных войск белапалякаў кінулі лепшых абаронцаў рэволюцыі. Гераічная Чырвоная Армія, узброеная ленінска-сталінскай стратэгіяй, маючы на чале такіх выдатных палкаводцаў, як Кліменцій Варашылаў. Серго Орджанікідзе, вызваліла совецкую краіну і Совецкую Беларусь з-пад панскай кабалы.

У радах слаўнай Чырвонай Арміі, якая вызваліла Беларусь ад белапалякаў, плячо ў плячо змагаліся рускія і беларус, украінец і грузін, армянін і казах. У гэтым мы бачым вялікую сілу сталінскай дружбы народаў, якая цэментуе нашы народы, аб'ядноўвае іх у адну магутную і непераможную сілу перад тварам ворагаў нашай радзімы.

Змрочнай і жудаснай была гісторыя Беларусі ў мінулым. Цяжкае жыццё рабочых і сялян, уціск культуры, цемра і галеча—вось што царскія сатрапы далі працоўнаму беларускаму народу.

Але і гэтыя жудасныя дні нельга параўнаць з тымі пакутамі, якія прынеслі народу польскія акупанты. Адзінаццаць месяцаў Беларусь стагнала пад бізуном пілсудчыны. Кроў і пажары, лямант і стогны катаваных чуліся па ўсёй змучанай краіне. Ні з чым нельга параўнаць тыя страшныя пакуты, якім падвяргала праклятае польскае панства беларускі народ.

Народ жорстка адпомсціў польскім панам за здзекі. Народныя паўстанні, партызанская вайна супроць польскіх акупацыйных войск, нарэшце, выгнанне Чырвонай Арміяй паноў з беларускай зямлі—вось паказчыкі гэтай жорсткай адплаты польскай шляхце.

Восемнаццаць год Совецкая Беларусь, вольная і роўнапраўная ў сям'і адзінаццаці рэспублік, пераможна будуе соцыялізм. За гэтыя восемнаццаць год стаў непазнавальным край беларускі. Замест сахі, якой убогі араты араў вузкую палоску, на палях Беларусі працуюць тысячы трактароў і камбайнаў; замест лучыны, якая асвятляла хату гэтага аратага, гарыць лямпа Ільіча.

Ярка расцвітае соцыялістычнае мастацтва Совецкай Беларусі, яго літаратура, узбагачаецца народная творчасць. Мы маем здольныя кадры ў галіне тэатра і музыкі. Совецкая ўлада іх вучыла і выхоўвала, дапамагае ім творча расці.

Спрадвеку ў беларускім народзе жыла святая нянавісць да сваіх ворагаў да польскіх паноў, магнатаў. Гэта нянавісць адлюстравана ў багацейшых скарбніцах народнай творчасці, у суровых песнях, у дасціпных казках, гумарыстычных творах.

Гэта спрадвечная нянавісць беларускага народа да польскіх паноў адлюстравана і ў творчасці лепшых нашых паэтаў і пісьменнікаў.

Янка Купала і Якуб Колас нямала гнеўных строф накіравалі на адрас польскіх паноў.

Пісьменнікі П. Броўка, М. Лынькоў, З. Бядуля, М. Клімковіч, К. Чорны, К. Крапіва ў сваёй творчасці таксама адлюстроўваюць гэту спрадвечную нянавісць народа да панскай Польшчы.

Росквіт мастацтва і літаратуры Совецкай Беларусі—рэзультат перамогі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Ленін і Сталін упершыню за шматвяковую гісторыю беларускага народа далі яму дзяржаўнасць, права на працу і адпачынак, права на асвету, права на карыстанне сваёй роднай мовай, права на шчаслівае, заможнае, культурнае жыццё.

Ленін і Сталін з'яўляюцца стваральнікамі БССР, стваральнікамі КП(б)Б. Яны стаялі ля калыскі нашай рэспублікі.

Наш народ адрадзіўся, выпраставаў свае прыгнутыя плечы. Пад благатворным сонцам Сталінскай Канстытуцыі яму, народу, належыць усё:

Увесь гэты скарб незлічоны, багаты,
Шырокія нівы і светлыя хаты,
Укрытыя лістам і цветам сады,
Залітыя срэбным святлом гарады.
Чыгункі і шахты, палі і заводы,
Глыбокія нетры і плынныя воды,
Высокага неба празрысты блакіт,
І гоманы пушчы, і шэлест ракіт—
Усё да апошняй пясчынкі зямлі
На ўзоранай трактарным плугам ралі
Ад краю—у край, ад заходу да ўсходу
Належыць майму маладому народу.
І скрозь над усім неабсяжным прасцягам
Жыццё пурпуровым абвеяна сцягам,
Дзе золатам радасці вышыты герб
У сонечных праменях молат і серп.

Подлыя ворагі народа, тройчы праклятыя трацкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія выраркі хацелі ўсё гэта адняць у працоўных мас.

Тройчы праклятыя здраднікі, фашысцкія сабакі праличыліся.

Совецкая Беларусь жыве і будзе жыць! Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам мудрага Сталіна яна пойдзе наперад да яшчэ большай радасці і шчасця.

КАЦЯРЫНА

(УРЫВАК З ПАЭМЫ)

Зноў ліповая калыска,
У якой сама расла,
У прыстанішчы бабыльскім
Радасць мацеры дала.

Пазнікалі ночы суму,
Зноў надзеі зацвілі,
Прасвятлелі вочы. Думы
Узнімаліся, плылі —

Па-над полем, па-над пушчай,
Над бурліваю ракой...
І пяе, пяе дачушцы,
Як спявала маці ёй:

Падрастай, мая дзяўчынка,
Падрастай, шчаслівай будзь!
Спі, галубка, Кацярынка,
Ветры злосныя гудуць.

Спіць вавёрка, спіць і ліска,
Спіць малы зайчок-касач,
Спі, малое, немцы блізка!
Ціха ты, не плач, не плач!

Можа, заўтра, ці сягоння,
Дума так гаворыць мне—
Тата ворага прагоніць,
Нас да сэрца прыхіне.

І заўсёды будзе з намі,
Будзе лашчыцца з табой,
Спі, дачушка, над барамі,
Над палямі непакой.

Толькі весткі аніякай
Ад Міколы не было,
Немцы выйшлі, дык палякі
Наляцелі на сяло.

Блізка году катавалі,
Ноч пажарамі гула,
Руйнавалі, рабавалі,
Вымяталі да-гала.

Дзе не стала чалавека,
Дзе парэзана сям'я —
Не прыпомніць гэткіх здзекаў
Ад пачатку дзён зямля

У бандытаў сказ кароткі:
Шомпал, шыбеніцы скрозь...
Дзе, якія там заробкі,
Хоць ты з хаты не выходзь.

Кацярына галадае,
Хоць у пролубку сама,
Толькі пеўнем пахаджае
Хутарскі кулак Кузьма.

Выгляд д'явальскі, харобры,
Ну, сапраўдны новы пан —
Акупантам солтыс добры,
Прыгнятальнік для сялян.

Кацярыну як убачыць,
Задаволена ён кпіць:
— Камісарык не іначай..
У зямлі сырой ляжыць.

Накарміў Мікола хлебам,
Дзе-ж ён дзеўся, пазаві,
Не хацела жыць як трэба,
Па-сабачаму жыві.

Кацярына пойдзе з ціхам,
Хай набэсціцца кулак,
Сэрцам чуе — пройдзе ліха,
Не! не будзе доўга так!

Не! ніякаю цаною
Не закатаваць народ!
Сэрца спраўдзіла. Вясною
Загрымеў, устаў усход.

Стрэлы полем загудзелі,
Зашумеў абшар лясны...
І сабрацца не паспелі,
Уцякаючы, паны.

Беглі так з чужое хаты,
Бышам чорт на крыллях нёс —
Дзе пакінулі гарматы,
Дзе тачанкі, дзе абоз.

Душна, душна ягамосці,
Досыць слёз мы палілі!
Вон, няпрошаныя госці,
Ад радзімае зямлі.

Заблішчэлі пяткі шпарка...
І нікога ўжо няма.
Дзе вы, лютыя канаркі,
Дзе ты, салтыс, дзе Кузьма?

Прытаіўся палахлівы,
У нары сядзіш звярком...
Што не ходзіш ганарліва
Ты па вуліцы сялом?

Наша свята, наша сёння,
Паглядзі ва ўсе канцы —
Гэта Арміі Чырвонай
Рушаць смелыя байцы.

Прэч, праклятыя падпанкі!
Вось дзе сокалы ідуць.
На руках дзяцей сялянкі
Ім усцешаных нясуць.

Колькі песень на спатканні,
Слоў агністых, маладых...
Баравыя партызаны
Далучаюцца да іх.

Кацярына паглядае —
За палкамі полк ідзе,
Аднаго яна шукае,
Дзе-ж Мікола родны, дзе?

Ці не ў гэтым ты паходзе,
Можа, дзе навек заснуў?
Дзень адзін, другі праходзіць,
Смутак сэрца агарнуў.

На дарогу за ракою,
Што бярозамі шуміць,
Выйдзе раніцай з дачкою,
Аж да вечара стаіць.

Здасца часам гул імклівы,
То падкоў іскрысты звон,
Раптам бачыць, што за дзіва,
Гэта, мусіць, праўда, ён?

На узлессі блізка, блізка
Паказаўся над гарой —
На кані ляціць навыскач,
Шапкай маша над сабой.

Вось ён любы. Як сустрэцца.
Да яго хутчэй, хутчэй,
Як мага бяжыць, а сэрца
Вырываецца з грудзей.

Захістаўся свет шырокі.
Закружылася вакол.
Не дабегла крокаў колькі —
Апусцілася на дол.

Як ачуняла, вясёлы
Погляд любага спаткаў,
На руках з дачкой Мікола
Кацярыну цалаваў.

1937-1938 Пятрусь БРОУКА.

ПАГРАНІЧНЫЯ НАСТРОІ

Ну, абнімі,
Душа мая, паняў прастор,
Лугі, любімыя табою,
Ты абнімі...
Дзе расцвіла
Вясна ў агнях чырвоных зор,
Ну, палюбуйся ты красою,
Што расцвіла.

Ну, ты зайграй
На струнах радасці грамчэй
Пра песню шчасця веснавую,
Ну, ты зайграй.
Хай мчацца ў даль
Акорды звонкія лягчэй
Мажорным тонам ў глуш нямую,
Хай мчацца ў даль.

Хай чуюць спеў,
Акорды шчасця і красы
Аж за слупамі ўзгоркі тыя,
Хай чуюць спеў.
Дзе цемры сон
Спавіў панурыя лясы
І за ракой палі глухія,
Дзе цемры сон.

Дзе смокча кроў
Зямля засохшая з таго,
Хто потам вымачыў яе навылет,
Дзе смокча кроў.
Няхай і там,
З-пад цёмных крат, з-пад ланцугоў
Узаўецца песні горды вылет,
Няхай і там...


Зайграй душа,
Зайграй на струнах весялей,
Пра песню шчасця веснавую,
Ну, ты зайграй...
З тваіх глыбінь
Хай спеў пракоціцца грамчэй
Туды, ў глуш-цемру векавую,
З тваіх глыбінь.

Хай голас твой
Разбудзіць громам у палях
Там сілу грозную паўстання,
Хай голас твой.
Хай сонца й там
З вышынь пад песні перамог
Гарэць агнём чырвоным стане,
Хай сонца й там.

І на палях,
Дзе гора з жудасцю ўсцвілі,
Хай бор магутны ўскалыхнецца,
У тых краях.
І ўзыйдзе там
З глыбінь замораной зямлі
Усё, што радасцю завецца,
Хай ўзыйдзе там.

Хай аддадуць
Дар сэрца людзі для вякоў,
Каб шчасце ў сонцы не завяла,
Хай аддадуць.
Ніколі больш
Каб над краінай зданню
Былая жудасць не паўстала,
Ніколі больш!

Адам РУСАК.



РАДЗІМА

Як расцвіла, якой магутнай стала
Мая радзіма, Беларусь мая.
З народам рускім
лёс ты свой звязала,
Здабыты ў жудасных баях.

Як цёпла і лагодна вее вецер,
Як зязюць ярка зоры ў вышыні.
Таму іду я ветру насустрэчу
Туды,
дзе над Крамлём гараць агні.

На поле гляну — вокам не акінуць
Прастораў аржаных, пшаніц густых.
Якою стала велічнай краіна,
Якою, Беларусь,
багатай стала ты!

Люблю, калі як срэбра зязюць росы,
Калі касцы калгасныя ідуць
Складаць траву мурожную ў пракосы,
Калі дзяўчаты песню запяюць.

І весела ўсміхаюцца мне далі,
Тут любае і дарагое ўсё.
Тут я зусім малым
спазнаў з адчаем,
Як пан нявечыў бацькава жыццё.

Тут дзеда польскі пан мясіў прыкладам,
Калоў тут дзеда роднага штыхом —
Таму,
што пана зваў ён лютым гадам,
Таму,
што зваў сябе большэвіком.

Дзе гай бярозавы—
там яр суровы,
Калісьці у смяротных тут баях
Паклалі воіны свае галовы,
Каб красавала Беларусь мая.

Даваў адпор тут рускі польскай шляхце,
Тут Балаховіча украінец граміў,
Твае, любімая радзіма, шчасце
Вялікі мудры Ленін бараніў.

Тут Сталін,
Варашылаў гартавалі
Цябе, вялі палкі праз чад і дым.
Што ты такой, мая радзіма, стала,—
Ты сёстрам абавязана сваім.

Твая старэйшая сястра, як маці—
Совецкага Саюза гордасць — Русь,
Цябе расціла, множыла багацці
Твае, мая матуля Беларусь.

Спаяных моцна дружбаю адзінай
Есць дзесяць у цябе
сясцёр-красунь.
Я—сын твой,
Беларусь, мая радзіма,
Табе адданасць я сваю нясу.

Анатоль АСТРЭЙКА.

ГЛЯДЗЕЎ НА НЁМАН Я УЧОРА...

Я быў ля Нёмана учора —
Плыве сабе, спакойна ў даль,
Аднак, трывога, рокат мора
Мне чуліся ў размове хваль.
Хоць праз эфір уночы «танго»
З Варшавы мяўкае: пра сад,
Любоў і мір,—я грукат танкаў
Пачуў, што выпраўляе кат,
Перад якім, ахвосце фрака
Падкурчыўшы, як пёс, пан Бек
Ступае, гнецца ледзь не ракам,
«дыпламатычны чалавек».
Дарма!
Мо' ласка будзе ў пана
Успомніць каб дваццаты год?
Праводзіў як, з якой «пашанай»
Пілсудскага тады народ.
Дарма губляе опрыт і сілы
Свае ў Берліне часты госць,
Бо у Варшаве для магілы
Зямлі панам даволі ёсць.
А што «Ад мора і да мора» —
Ступіце толькі лішні крок...
Глядзеў на Нёман я учора,
Глядзеў на той маўклівы бок —
Ні шолаху травы, ні спеву.

І толькі дол змарнелы там
Бялее ад камення гневу,
Што будуць помстаю панам.
Было відаць мне, як бяздонне
Лягло прымежнаю ракой
Паміж мінулым і сягоння
Краіны сонечнай маёй.
Вы маеце яшчэ надзеі,
Майстры дыпламатычных змоў
Як вашы подлыя лакеі,
Вы будзеце разбіты зноў:

Бо грознай сілаю, высокай
Узброены большэвікі,
Ад Менска да Владзівастока
Стаяць рэспублікі палкі.

А. БУРДЗЕЛЬ.

ПАСТАНОВА

Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР

ПРЭЗІДЫУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАУЧАГА КАМІТЭТА БССР НА ПАДСТАВЕ АРТЫКУЛА 37 КАНСТЫТУЦЫІ БССР ПАСТАНАУЛЯЕ:

СКЛІКАЦЬ ПЕРШУЮ СЕСІЮ ВЯРХОУНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР 25 ЛІПЕНЯ 1938 года ў гор. МЕНСКУ.

ВЫК. АБ. СТАРШЫНІ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАУЧАГА КАМІТЭТА БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ.

ВЫК. АБ. САКРАТАРА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАУЧАГА КАМІТЭТА БССР
А. ЕРМАК.

8 ліпеня 1938 г. гор. Менск.

МУЖНАСЦЬ І АДВАГА

Раніца. Свежая вясенняя раніца. Прачынаецца горад. Па сонечных гулкіх вуліцах ідзе, як заўсёды абыякавы да ўсяго, сутулы зубаўрачэбны тэхнік Каміонскі. Ен адыходзіць ад цэнтра, ідзе да ўскраін—да Школьнай вуліцы. Ен бачыць на вуліцы маладых хлапцоў і дзяўчат. Яны выйшлі сустракаць вясну,—што можа даць радасць гэтай моладзі акупіраванага, у клешчах жандармерыі і дыфензывы зажатага горада, што можа даць ёй радасць, як не яркае сонца, усё абнаўляючая вясна, якая абуджае сілы, кліча, хвалюе светлымі надзеямі?..

Здаецца—гэта не акуляры блішчаць у зубаўрачэбнага тэхніка Каміонскага. Здаецца—радасцю і любоўю праменяцца вочы заўсёды знешне бясстраснага чалавека. Можа гэта і так—чаму-ж не любавацца Каміонскаму, чаму не радавацца, гледзячы на гэту маладую парасль — ёй належыць будучае, у яе раданае—як гэта вясна, светлае—як гэты сонечны дзень, жыццё наперадзе. І яна—таксама змагар за гэта жыццё. Каміонскі ведае: сярод гэтых хлапцоў і дзяўчат — не адзін комсамолец, верны памочнік партыі. І не толькі сустрэць вясну выйшлі яны сёння на вуліцу. Шмат хто з гэтых юнакоў атрымаў даручэнне сачыць за ўсім, што адбываецца на вуліцы. Яны не ведаюць, для чаго гэта патрэбна—партыя даручыла, значыць, партыя прадпрымае сёння штосьці сур'ёзнае. Яны не ведаюць і гэтага сутулага чалавека, шмат хто з іх нават і не чуў яго імя. Але — так трэба. Такі закон падпольнай партыйнай работы: добра, калі кіруючых работнікаў ведае невялікае кола членаў арганізацыі.

Адзін за адным, праз значныя прамежкі часу, непрыкметна для прахожых, ідуць на яўку дэлегаты канферэнцыі. Каміонскі—Фалк знаёміцца з імі, ён пільна глядзіць на іх, узіраецца ў твар гэтых мужных людзей, што цвёрда выконваюць волю партыі. Ён не ведаў іх асабіста да гэтага дня, але ён вельмі добра ведаў іхную работу, ён адчуваў іх блізка ля сябе—плячо да пляча. У далёкіх вёсках павета сустракаючы на кожным кроку жандарскія пастэрункі і кулакоў-падпанкаў, умела абмінаючы іх—яны вядуць работу ў працоўнай масе, няўхільна ідучы да вызначанай мэты.

Дзелавіта, без лішніх слоў—дорага кожная секунда—працуе канферэнцыя. Яна абагульняе велізарны вопыт падпольнай работы, прадстаўнікі з месц атрымліваюць тут глыбокі і змястоўны ўрок партыйнай работы, класавай барацьбы. Фалк падводзіць вынікі мінулага этапу работы, накідвае канкрэтныя перспектывы далейшага шляху. Ен спакойны. Ен дужы тою сілаю, якая аб'ядноўвае ўсіх удзельнікаў канферэнцыі непахіснай верай у поўную перамогу справы рабочага класа, гатоўнасцю ўсе свае сілы, усё сваё жыццё аддаць за гэту перамогу.

І ніхто не ведае, што гэты спакойны чалавек, у якога такія размераныя рухі і чаканныя, узважаныя словы, правёў сёння бяссонную ноч. Ен не спаў, ён хваляваўся, рыхтуючыся да канферэнцыі. Гэта было хваляванне самага раднага дня ў жыцці чалавека...

Канферэнцыя падыходзіць к канцу, прымаецца рэзалюцыя. Моцны стук у дзверы перапыняе работу. З месца ўзняўся Фёдараў і падышоў да дзвярэй. Стук паўтарыўся. Незнаёмы чалавек стаяў у адчыненых Фёдаравым дзвярах. Зазірнуўшы праз плячо Фёдарава ў пакой і кінуўшы пару слоў прабачэння—«не туды трапіў», — ён захлопнуў дзверы. Цяжкое маўчанне. Нечаканае наведванне прымусіла ўсіх насцеражыцца. Заклікаўшы канферэнцыю прадаўжаць работу, Фалк збірае са стала анкеты, даклады з месц, ён кладзе ў кішэню толькі-што прынятую рэзалюцыю. Перасцярога не дарэмная—праз некалькі мінут к дому падышоў атрад жандараў. Людзі ўсхапіліся з месц. Фалк заспакойваюча ўзняў руку:

— Спакойна... Таварышы, бяжыце! Вас чакае работа!—цвёрда прагучаў яго голас:—у вакно, праз сад...—спакойна паказаў дарогу.

У дзверы ламіліся жандары. Адзін за другім выскаквалі ў вакно ўдзельнікі канферэнцыі. Фалк ірваў на кавалкі пратакол, рэзалюцыю, анкеты. Калі Фёдараў не мог стрымаць напору жандараў і яны ўварваліся ў пакой — у ім не было ўжо ні аднаго дэлегата з месц.

***

Прайшло некалькі дзён. Па гораду расклеена аб'ява за подпісам капітана і каменданта этапнай станцыі Бразулевіча. Жандарскі кат халоднакроўна паведамляў, што Каміонскі, Фёдараў і Баброва «за тое, што ў Бабруйску заснавалі тайны комуністычны камітэт і арганізавалі на вёсцы партызанскія атрады з мэтай выклікаць узброены рух, якія ўчынкі складаюць цяжкое злачынства здрады» — прыгавораны «да кары смерцю праз расстралянне». Аб'ява паведамляла далей, што «прыгавор выканан праз 2 гадзіны пасля яго абвяшчэння, у 19 г. 57 м.»

Не ўсё сказала гэта аб'ява іезуітажандара. Не смеў баязлівы кат сказаць народу аб тым, як здзекваўся ён з лепшых сыноў працоўных на этапнай станцыі панскага «правасуддзя». Але не маглі ўтаіць праўды найміты польскіх абшарнікаў і фабрыкантаў. Праўда прасачылася праз акрываўленыя сцэны дэфензывы, праўда пранікнула ў рабочыя масы. Неўзабаве ўвесь горад ведаў пра зверскія катаванні арыштаваных.

Вызваляючы Фёдарава ад кайданаў, каты казалі яму:

— Калі выкажаш удзельнікаў арганізацыі, мы цябе вызвалім. Ты-ж рускі чалавек і ты абавязан гэта зрабіць!

Жандары ўсімі спосабамі «абуджалі нацыянальнае пачуццё» ў Фёдарава. На яго вачах яны збівалі Каміонскага—Фалка. Адмаўляючы даць вады Каміонскаму, яны «міласліва» падносілі яе Фёдараву. Фёдараў адказаў як мог—ён плюнуў у твар іезуіта-афіцэра. Яго зноў закавалі і зверска збілі...

Кідалася ў гарачцы хворая на тыф Баброва. Яна прасіла прыслаць доктара, — жандары смяючыся паправілі на яе руках і нагах кайданы...

Назаўтра быў суд—кароткая судовая камедыя з загадзя падрыхтаваным катамі ў ролі суддзяў прыгаворам. Ні аднаго слова не вырвалі ў знявечаных людзей каты-суддзі. Яны былі спакойныя, мужныя байцы вялікай партыі Леніна: канферэнцыя выканала сваю задачу, яна дала напрамак партыйнай работы, яе ўдзельнікі засталіся на волі, яны павядуць арганізацыю цвёрда і няўхільна наперад—да перамогі.

Узмоцнены канвой вёў у крэпасць пакалечаных Каміонскага і Фёдарава. Баброва не магла ісці, яе прынеслі да месца расстрэлу на насілках. Да Каміонскага падышоў равін. Каміонскі адхіліў рукой гэтага панскага прыслужніка:

— Калі равін хоча зрабіць мне паслугу, дык толькі не пасярэдніцтвам перад богам і панамі! Напішыце ў Кімшын маім бацькам, што я памёр за вялікую справу соцыялізма...

Афіцэр таропка перапыніў Каміонскага, падаўшы каманду салдатам. Каміонскі запеў «Інтэрнацыянал». Трывожны шум векавых хвой на гласісе бабруйскай крэпасці зліўся з гнеўнымі грознымі словамі баявой песні пралетарыята. Стоячы побач з Каміонскім, спяваў Фёдараў. У песню ўступіў кволы голас прывязанай да дрэва Бабровай.

Захісталіся дулы наведзеных на смяротнікаў вінтовак, дрыжачыя рукі салдатаў не маглі ўзяць прыцэлу. Прагрымела некалькі бязладных стрэлаў. Але не сціхаў пераможны «Інтэрнацыянал». Салдаты апусцілі вінтоўкі. Работу ката таропка выканаў спалоханы замяшаннем салдат афіцэр — ён сам расстраляў асуджаных.

Такая была праўда, пра якую не смеў сказаць капітан Бразулевіч. Гэта праўда ўліла новыя сілы ў сэрцы прадаўжальнікаў справы мужнага і вытрыманага кіраўніка большэвіцкага падполля Каміонскага, скромнага і адданага партыі чыгуначніка Фёдарава загартаванай большэвічкі Бабровай, якая не страціла сілы і цвёрдасці ў тыфознай гарачцы.

Назаўтра горад пярэсціў ад раскіданых і расклееных пракламацый. Два комсамольцы пад выглядам шкляроў прабраліся ў сэрца польскага гарнізона—у крэпасць з пракламацыямі—зваротам да польскіх салдатаў.

Недалёка ад Бабруйска партызаны пусцілі пад адхос польскі поезд з гарматамі і снарадамі.

У радах польскай арміі расло замяшанне. Пачасціліся забойствы салдатамі афіцэраў. Афіцэр, што расстраляў Каміонскага, Фёдарава і Баброву, быў знойдзен звязаным у рацэ. Відаць, не дрогнулі рукі звязваўшых яго салдатаў,—яны прыйшлі да свайго класа ў дзень і гадзіну, дакладна зафіксіраваную аб'явай іезуіцкага этапу.

Хв. ШЫНКЛЕР.

ПОДВІГ ДАЯРКІ

(Пагранічны эпізод)

У глухую вёску, патанулую сярод пагранічных лясоў Палесся, прыносяць тэлефонаграму. Пісьманосец расшуквае не настаўніка, не агранома, не члена сельсовета, ветлівага старога Бабкова. Не. Яму трэба даярка калгаса «Рубеж» Зінаіда Кажэўнікава. Іменна яна. Пісьманосец не памыляецца; вось і на паперы напісана: перадаць даярцы — імя, імя па бацьку, прозвішча.

— Асаблівая павінна быць у вас даярка, — гаворыць пісьманосец старому Бабкову, сустракаючы яго на вуліцы. Закурыць дасцё, дзядуля?

— Можна даць. А наконт даяркі — ты правільна.

— Яна, што кароў добра даглядае?

— І гэта ёсць.

— Значыць, малочная справа тут не ўсё? — цікавіцца пісьманосец, рукамі затуляючы агеньчык запалкі ад ветру.

— Як-жа не ўсё! Больш яе ніхто ў нас не надойвае.

— Ну, значыць, таму сёння раніцой і званілі са сталіцы ў сельсовет. Перадайце, маўляў, Зінаідзе Кажэўнікавай...

— Мусібыць таму, а можа і не таму, — загадачна прамовіў добрадушны стары, дражнячы маладога пісьманосца ў вышытай касаваротцы і штанах галіфэ.

— Бач, прыбраўся, — жартуе стары.

А як-жа, — аўтарытэтна заяўляе яго малады субяседнік, раніцой са сталіцы, не да каго-небудзь, а іменна да Зіны Кажэўнікавай. Да яе — і кропка. Пойдзем, пакажы, дзе жыве.

Яны закрочылі ў канец вёскі. Пераступіўшы праз невысокі плот, стары пастукаў у крайняе акно:

— Кажэўнікава, выходзь. Справа да цябе ёсць.

Праз мінуту з хаты выйшла пажылая жанчына ў вялікіх ботах, з накінутай на плечы хусткай. Яна спынілася ля дзвярэй, запрашваючы ўвайсці.

— Не, дзякую, мы да цябе на мінутачку — сказаў Бабкоў. — Так што прачытай вось паперку і распішыся. Цябе выклікаюць у Менск, ва ўрад.

— Мяне? — здзівілася Кажэўнікава і пачырванела.

З гэтай мінуты ўсё ёй здавалася сном. Але не—які-ж сон, калі на другі дзень раніцой прыехала машына і фыркаючы спынілася каля самых варот. Шофер у вялікіх скураных пальчатках ліха выскачыў з кабінкі. Зіне не верылася.

— Вы за мною? Можа, вы блытаеце?

— Як гэта блытаю, — пакрыўджана сказаў шофер, вымаючы блакнот з кішэні. Глядзіце, тут вось цэлая праграма.

З хаты выскачылі дзеці Кажэўнікавай — аднагодкі Міша і Грыша і старэйшая ў сям'і Вара. Яны спыніліся каля дзвярэй, не даючы веры, што гэта новенькая машына прыехала за іх мамаю. Каля варот пачалі збірацца калгаснікі.

— Едзеш?—спытаў Бабкоў, кінуўшы галавой у бок машыны.

— А я ўжо з вечара падрыхтавалася. Вось толькі маме скажу, што для дзяцей зрабіць, і няхай мяне гэтыя дні на рабоце заменіць. Трэцяга дня дзве каровы сцяліліся, за імі догляд патрэбны. Як тут без мяне.

— Язджай, язджай, — сказаў Бабкоў, — справімся.

Покуль Кажэўнікава збіралася, шофер пасадзіў дзяцей у машыну і павёз катацца. Міша, Грыша і Вара ўтрох важна селі на мяккае сядзенне і закідалі шофера патокам цікаўных пытанняў.

Паварачваючы назад, шофер спытаў у Вары:

— У вашу маму стралялі?

— Два разы, а яна не спужалася, бягом, бягом — і прывяла пагранічнікаў. Грыша заплакаў, а я не. Мы былі з мамай на полі.

— Не заплакаў я, не заплакаў, — пакрыўджана зацягнуў Грыша, — гэта Міша спалохаўся.

Шофер з павагаю адчыніў даярцы дзверцу аўтамабіля, запрашаючы сесці ў кабінку.

— Тут вам будзе лепш, не так калыхае...

Праз некалькі мінут, узнімаючы клубы пылу, машына схавалася за паваротам.

***

Была гарачая рабочая пара. Кажэўнікава не толькі паспявала даглядзець кароў, але і дапамагала на полі. У гэты дзень старая паехала ў больніцу і Зіна парашыла ўзяць дзяцей з сабою на поле. Старэйшая — Вара — пасадзіла аднагодкаў на самадзельную павозку і разам з маткай павезла іх, дастаўляючы вялікую прыемнасць здаровенькім карапузам. На полі дзеці занялісь збіраннем кветак. Вара ганялася за матылямі.

Даярка працавала ў старане, хутка і ўмела выбіраючы пустазелле з грэчкі. Захацелася піць:

— Вара, вазьмі жбанок і збегай па ваду.

Рэчка за поўкілометра. Яна цягнецца ўсцяж граніцы, то віючыся, то выцягваючыся ў струнку, адсвечваючы халоднай празрыстай вадою. Рэчка забароненым рубяжом легла на краю калгасных земляў, багатых плодароднасцю. За рэчкаю — чужыя людзі, за рэчкаю — другі свет, непадобны на нашае жыццё, як дзень на ноч. Вара і тая ведае аб дзецях, што жывуць у холадзе і голадзе там, за рэчкаю, аб жабраках, што ходзяць з торбамі, аб жандарах, якія да крыві збіваюць беднякоў. З якім хваляваннем слухала яна ў школе расказ настаўніцы аб няшчасным жыцці яе равеснікаў там, за рэчкаю, як ёй шкада іх. Калгасаў там няма, а землі ці графскія, ці панскія.

Вара бяжыць да рэчкі і ўглядаецца ў далеч. Як дзіўна — вузенькая рака, а за ёю ўжо зусім іншае жыццё. Ні такіх, як у нас, школ, ні клубаў, ні дзіцячых свят ні калгасаў, ні працадзён. А ў мамы з бабуляй 730 працадзён. Аднаго зерня цэлую грузавую машыну атрымалі. Набліжаючыся да рэчкі, Вара запавольвае крок. «Дзе-б ёй зручней набраць вады? А вось пясочак». Яна бяжыць, прымінаючы траву.

Раптам з-за прыбярэжнага хмызняка выходзяць два чалавекі. Вара роняе жбанок і спалохана адступае назад.

— Чакай, дзяўчынка, — гаворыць адзін з невядомых, набліжаючыся да яе.

Вара хоча крыкнуць, але горла перасохла і словы застраюць недзе ўнутры. Невысокі падышоў бліжэй, пагражае пальцам. — Цішэй. Крыкнеш — кінем у рэчку...

— Ты не бойся нас, — умешваецца другі. — Скажы, людзей паблізу не бачыла, пагранічнікі табе не сустракаліся? Стой, стой — сказаў другі, бачачы, што дзяўчынка хоча бегчы.

— Сядай, пасядзі з намі, мы цябе не кранем.

— Мяне мама чакае, — сярдзіта сказала Вара і хацела пайсці. Але невысокі затрымаў яе.

— Мы цябе зараз адпусцім. Ты толькі раскажы, як абыйсці вёску.

— Я не ведаю.

— А хіба ты не тутэйшая?

— Не.

— А адкуль?

— А што вам да гэтага, — агрызнулася Вара. — Я-ж у вас не пытаюся...

— Запытайся, запытайся. Мы рыбакі. Рыбачылі цэлую ноч, ды вось і заблудзіліся.

— Тут лавіць рыбу нельга, — упэўнена сказала Вара.

— Вара, Вара, — пачуўся здалёк голас Кажэўнікавай. Занепакоеная доўгаю адсутнасцю дачкі, яна парашыла пайсці за ёю да рэчкі.

Вара хацела адказаць, але невысокі падскочыў да яе:

— Маўчы, а то задушу.

Дзяўчынка спалохана пераводзіла вочы з аднаго на другога, у галаве яе раптоўна нараджаліся планы ўцёку. Але яе не пускалі, трымаючы за рукі.

— Мама, мама — мяне не пушчаюць — закрычала яна.

У гэты час удар кулаком па галаве аглушыў яе, і яна страціла прытомнасць.

Кажэўнікава, пачуўшы ўстрывожаны голас дачкі, кінулася да кустоў, але выстралы загарадзілі ёй дарогу. Яна не разгубілася і прыгнуўшыся да зямлі, пабегла да ляска, дзе павінны былі быць пагранічнікі. Потым яна сама здзіўлялася той рашучасці, якая авалодала ёю тады. Дачка Вара ў чужых руках! І раптам стрэл. Першы раз трапіла яна пад смертаносны агонь. Аднойчы муж яе, калі вярнуўся з фронта, дык расказваў аб тым, што перажываеш у такое імгненне. Ці страшна ёй? Не, не страшна. Толькі-б хутчэй дабегчы да ляска. А вось насустрач імчацца пагранічнікі — адзін... два... Ледзь пераводзячы дыханне, яна бяжыць насустрач.


— Хутчэй, хутчэй, туды, — і паказаўшы рукой у бок берага, забыўшы пра небяспеку, яна бяжыць наперадзе пагранічнікаў.

Адзін з байцоў пераганяе яе і засланяе сваімі грудзьмі. Невядомыя, падняўшы рукі, здаюцца... Вара са слязамі на вачах кідаецца да маці.


— Дзядзя, дзядзя, яны толькі-толькі кінулі нешта ў раку, — гаворыць дзяўчынка пагранічнікам.

Праз гадзіну з дна ракі дасталі два наганы, каробку патронаў і нож.

Е. САДОЎСКІ.



Новая гасцініца у Менску. Фота Каплінскага.



Палац піонераў і окцябрат у Менску. Фота Каплінскага.

ТЭМА НАРОДНАГА ГЕРАІЗМУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

Спрадвеку жыла ў працоўным беларускім народзе войстрая нянавісць да самых лютых сваіх ворагаў—да польскіх паноў. Стагоддзямі складалася і расла гэта нянавісць. Закабаленне беларускага (і украінскага) народа ў XIII—XIV стагоддзях, нясцерпны гнёт, фізічныя і маральныя здзекі з народа ў часы прыгону, белапольская акупацыя 1920 года, калі польскія паны хацелі задушыць маладую Совецкую Беларусь, крывавая правакатрская дзейнасць у нашым тылу шпіёнаў і дыверсантаў, засылаемых польскай разведкай, — было за што і ёсць за што беларускаму народу ненавідзець белапольскіх паноў. Гэта нянавісць знайшла яркі адбітак у шматлікіх казках, песнях, прыказках, складзеных у народзе, дзе польскія паны і ксяндзы падвергнуты знішчальнаму, бязлітаснаму абсмяянню. Колькі гневу, знішчальнага сарказму ў такіх, напрыклад, пэрлах народнай творчасці, як казкі «Мужык і пан», «Як Пятрок правучыў пана» і інш.

Вялікай заваёвай беларускай совецкай драматургіі з'яўляецца тое, што асноўныя этапы гэтай барацьбы хоцьбы ў эскізным плане адлюстраваны ў лепшых п'есах нашых драматургаў. «Кацярына Жарнасек», «Салавей», «У пушчах Палесся», «Партызаны», — зместам гэтых твораў і з'яўляецца адвечная барацьба беларускага народа супроць сваіх крывавых катаў — польскіх паноў — на розных этапах гісторыі народа.

П'еса М. Клімковіча «Кацярына Жарнасек» прысвечана той гістарычнай эпосе, калі польскія магнаты і шляхта забралі ўладу над беларускім народам, што прывяло да надзвычайнага ўзмацнення эканамічнага ўціску і да штучнага апалячвання беларускага народа. Паўстаннямі, руйнаваннем княжацкіх замкаў і забойствам сваіх прыгнятальнікаў адказвае народ на здзекі «заваявальнікаў».

Аб гэтым-жа сказана ў падручніку «Кароткі курс гісторыі СССР» пад рэдакцыяй праф. Шастакова: «Цяжка жылося украінцам, беларусам і рускім пад уладаю сваіх князёў і баяраў. Але яшчэ цяжэй стала іх жыцце пад уладаю польскіх і літоўскіх захватчыкаў, якія зрабілі ўсіх сялян прыгоннымі».

М. Клімковіч здолеў гэтую формулу расшыфраваць у яркіх мастацкіх вобразах, паказаць твар гэтых паноў Заенчкоўскіх, ксяндзоў і арыентыраваўшыхся на панскую Польшчу беларускіх князёў, адзін з якіх — Іван Капуста — ярка паказан у п'есе. З няменшай сілай паказаў драматург народ, яго нянавісць да прыгнятальнікаў, яго сілу і свабодалюбства. Асабліва ўдаўся М. Клімковічу вобраз старой Марыны, якая толькі і жыве помстай, нянавісцю да крывавых гвалтоўнікаў. У вобразе Марыны дыша тая-ж непераможная сіла нянавісці, якую мы адчуваем у народнай творчасці. «За нашых дзяцей, за забітых бязвінна, сваімі дзяцьмі адказаць яны вінны»— гаворыць старая Марына, і выконвае свой замысел.

У п'есе яшчэ пямала яркіх вобразаў — паэтычны вобраз Кацярыны; дзед Ахрэм; Рыгор, які марыць, што народ

«з'яднаецца калі,
Агонь вялікі зашугае
І спаліць панства на зямлі».

Гістарычная п'еса «Кацярына Жарнасек» гучыць як сучасная, таму што ў п'есе правільна і па-мастацку перакапальна паказана, як чатыры стагоддзі назад змагаўся беларускі народ з панамі — польскімі ў асаблівасці — за сваю свабоду.

Наступную эпоху ў гісторыі змагання народа супроць польскіх паноў адлюстроўвае п'еса З. Бядулі «Салавей». Яшчэ больш узмацніўся ўціск, яшчэ танчэй сталі сродкі высмоктвання апошніх сокаў з народа. «Эстэтычная асалода» пана Вашамірскага каштуе надзвычай дорага народу, лепшыя яго сыны і дочкі падвяргаюцца фізічнаму і маральнаму катаванню ў прыгонным тэатры паноў Вашамірскіх. Панна Ізабела не падзяляе «мастацкіх захапленняў» мужа, затое яна вынаходлівая ў знаходжанні новых сродкаў нажывы за кошт крыві народа. Панна знішчае цэлую вёску, выкідвае сялян на пустыры, каб развесці на месцы вёскі возера з рыбнай гаспадаркай. Звярыная прагнасць паноў, якія літаральна жыруюць на поце і крыві народа, поўная іх амаральнасць, самадурства і выраджэнне з вялікай мастацкай сілай паказаны ў п'есе Змітрака Бядулі.

Як і М. Клімковіч, З. Бядуля побач з вобразамі паноў выводзіць вобраз ксяндза—вартага памочніка пана ў справе эксплаатацыі працоўнага народа. Як і п'еса Клімковіча, п'еса «Салавей» канчаецца народным паўстаннем. Гэта арганічна выцякае з тэмы, абранай абодвума драматургамі, — барацьбы народа супроць сваіх прыгнятальнікаў. Свежа і паэтычна паказан у п'есе З. Бядулі працоўны беларускі народ. Правадыр паўстання Адам — «салавей» — увасабленне не толькі волі да свабоды, да справядлівасці народа, але і яго таленавітасці, тых вялікіх творчых сіл, якія мялі і душылі эксплаататарскія класы і якія такім буйным цветам расцвілі ў вызваленых народаў Совецкага Саюза.

П'есы Я. Коласа і К. Крапівы прысвечаны нядаўняму мінуламу — вызваленню Совецкай Беларусі ад белапольскіх акупантаў. 18 год гэтай вялікай даты святкуе сёння шчаслівая Совецкая Беларусь. Абраўшы адну тэму, драматургі не паўтараюць адзін другога ў сваіх п'есах. Тэма гэта настолькі вялікая, што можа паслужыць — і безумоўна паслужыць — матэрыялам яшчэ для многіх высокаякасных мастацкіх твораў.

Якуб Колас у сваёй п'есе стварыў вобраз беларускага селяніна, дзеда Талаша, які ў горніле грамадзянскай вайны вырастае ў сапраўднага народнага героя. Узнімаючы ў пачатку п'есы вілы супроць польскіх жаўнераў, якія забіраюць яго астатняе сена, ён у канцы п'есы становіцца аўтарытэтным, выдатным атаманам партызанскага атрада, які трапна б'е палякаў і аказвае вялікую дапамогу Чырвонай Арміі. Дзед Талаш — тыповы абагульняючы вобраз, прыклад другім нашым пісьменнікам, як трэба канцэнтраваць лепшыя характэрныя рысы народа для стварэння яркага мастацкага вобраза народнага героя. Тыповымі з'яўляюцца не толькі свабодалюбства Талаша, яго народны гумар, поўныя мудрасці і сарказму прыказкі, — тыповая яго нянавісць да польскіх паноў, якая арганічна жыве ў нашым народзе, — Талаш называе іх «смярдзючыя паны». Тыповы шлях ператварэння асабістай нянавісці ў класавую, шлях ад асабістай помсты—да помсты за ўвесь народ. Такой-жа нянавісцю да польскіх паноў дышаць і іншыя вобразы з народа.

Яркі вобраз адступніка, здрадніка народнай справе стварыў Якуб Колас у асобе Саўкі Мільгуна. Гэты вобраз, а таксама вобраз лакея польскай ваеншчыны нацыянал-фашыста Галініча, абвайстраючы сюжэт п'есы, робіць яе яшчэ больш актуальнай для нас, паказваючы мярзотную ролю агентаў фашызма, якія прадавалі за грошы народную кроў. Праўда, гэта тэма — засылка шпіёнаў панскай Польшчай да нас у тыл — толькі мімаходзь асветлена ў п'есе Я. Коласа, як і ў п'есе К. Крапівы.

П'еса К. Крапівы «Партызаны» паказвае рост партызанскага руху на Беларусі ў часы панавання белапольскіх інтэрвентаў. Як і Якуб Колас у сваёй п'есе, К. Крапіва паказвае, што толькі дзякуючы Чырвонай Арміі, дзякуючы дапамозе рускага народа беларускі народ дабіўся вызвалення сваёй зямлі ад крывавага бота інтэрвентаў.

У абодвух п'есах паказана кіраўніцтва комуністычнай партыі партызанскім рухам (вобраз Жыбуля ў п'есе Коласа, Скібы — у п'есе Крапівы).

Абедзве п'есы таксама выводзяць вобраз вясковага кулака, які яднаецца з польскімі панамі для барацьбы супроць народа.

У п'есе Крапівы гэта тэма больш распрацавана і паглыблена. Акрамя кулака Маргуна, аўтар вывеў вобраз дачкі яго — Кацярыны, якая трымае ў палоне закаханага ў яе Рыгора. На вобразе Рыгора аўтар паказаў тую дваістасць душы селяніна, якая цягнула яго то ў бок паўстання супроць паноў, то ў бок здрады агульнай справе для здабыцця асабістага дабрабыту. Перамагае працаўнік, гаротнік над дробным уласнікам, і гэта ў войстрай драматургічнай форме паказана у шостай сцэне п'есы. П'еса Крапівы праўдзівая і не прэтэндэнцыйная, разам з тым аўтар дабіўся яркай драматычнасці кожнай асобнай сцэны.

У п'есе Крапівы, як і ў трох названых вышэй п'есах, арганічна праводзіцца тэма супроць стаўлення высокіх маральных якасцей народа звярынай злосці, самадурству, садызму, воўчым адносінам адзін да другога ў лагеры паноў. У п'есе Крапівы гэта супроцьстаўленне праводзіцца асабліва паслядоўна і арганічна.

Значна слабейшым, чым у п'есе Коласа, атрымаўся ў Крапівы вобраз кіраўніка партызанскага атрада. Даніла Дрыль здаецца асабліва не яркай фігурай, калі параўноўваць яго з дзедам Талашом. Затое рад іншых вобразаў п'есы — вялікая заваёва Крапівы як мастака, драматурга: дзед Бадыль, Рыгор, Марылька, Скіба і інш. Злосна высмейвае аўтар дэгенератыўнага шляхціча Шмігельскага.

Падагульняючы сказанае, можна зрабіць вывад, што беларускія драматургі здолелі адлюстраваць у сваіх п'есах асноўныя этапы вялікай гістарычнай барацьбы працоўнага беларускага народа супроць крывавых польскіх паноў. Створаны п'есы вялікай мастацкай сілы, якія праўдзіва малююць жывыя старонкі гэтай барацьбы, герояў народа і ворагаў яго (асобныя недахопы і мастацкія зрывы ў гэтых п'есах адзначаны крытыкай). П'есы гэтыя вучаць яшчэ больш ненавідзець адвечных ворагаў нашага народа, выклікаюць пачуццё патрыятызму, пачуццё вялікай удзячнасці партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам якой народ наш вызваліўся ад крывавага прыгнёту і адваяваў сабе шчаслівае жыццё.

Але чатыры пералічаныя п'есы далёка не вычэрпваюць гэтай тэмы. Нашы драматургі павінны стварыць п'есы, дзе была-б паказана барацьба народа з польскімі фашыстамі, — паказаць, як органы НКВД пры дапамозе ўсяго народа выкрылі тройчы праклятых наймітаў польскай разведкі, якія гадамі рабілі свае крывавыя справы ў нашай краіне, прадаючы адваяваную працоўным народам свабоду і зямлю фашысцкім акулам. На гэту тэму нашы драматургі абвязаны напісаць яркія высокаякасныя творы.

Не ўзяліся яшчэ нашы драматургі за смелую, вельмі пачэсную справу: паказаць у п'есах вобраз генія, чалавека, які стварыў беларускую дзяржаўнасць, — вобраз вялікага Сталіна.

Вядома таксама, якую вялікую ролю ў разгроме белапалякаў і ў барацьбе беларускага народа за сваё шчасце адыгралі таварышы Серго Орджанікідзе, Л. М. Кагановіч, Н. І. Ежоў, М. В. Фрунзе. П'есы пра таварыша Сталіна, пра таварышоў Орджанікідзе, Кагановіча, Ежова, Фрунзе павінны стварыць нашы драматургі да 20-й гадавіны вызвалення БССР ад белапалякаў.

Г. ГАРДОН.

ЯНКА-ПАРТЫЗАН

Апавяданне

У гэту цёмную ліпеньскую ноч Янка прачнуўся ад раптоўнага гарматнага выбуху.

Здрыганулася хата. У невялічкіх вокнах задрынчэлі шыбы, са столі пасыпаўся пясок.

Янка падхапіўся з ложка, зірнуў у вакно і, таропка апрануўшыся, выбег на вуліцу.

Некалькі суседніх будынкаў ужо былі абняты агнём. За ракой стракаталі кулямёты, у хлявах нема раўлі каровы, перапалоханыя жанчыны з груднымі дзецьмі, пакідаючы вёску, спяшаліся за гумны. Дзесьці ў палыхаючым будынку енчыў чалавек...

— Мама! Мама!.. — закрычаў хлапчук.

Янка разгублена замітусіўся па вуліцы. Спачатку ён хацеў было бегчы да свайго бацькі ў партызанскі атрад, куды ён яшчэ ўчора адвячоркам заносіў харчы, але ў канцы вуліцы ўжо чуўся шматлікі тупат коней і крыкі раз'юшаных белапалякаў.

Паперадзе банды, узмахваючы сабляй, ехаў афіцэр. Ён наляцеў на жанчыну, якая, тулячы да сябе маленькую дзяўчынку, толькі-што выскачыла з палыхаючага будынка, і ўдарам саблі зваліў яе пад ногі каню.

Перапалоханы хлапчук прытуліўся да сцяны, не ведаючы што рабіць. Ён зусім не прыкмеціў, як з усіх бакоў хату абкружылі жаўнеры і прамень белага ліхтарнага святла асляпіў яго вочы.

— А-а-а, псякрэў! — прахрыпеў суровы голас жаўнера. — Дзе ойцец твуй?.. — схапіўшы за шыю хлапчука, запытаўся ён, — ну?!

Хлапчук маўчаў.

Халодная кастлявая рука белапольскага жаўнера сціскала, давіла Янкаву шыю.

— Муў, псякрэў! — штурхаючы хлапчука, прыставаў раз'юшаны белапаляк.

У хлапчука папямнела ў вачах, ад болю павяло ў галаве.

— Партызан ойцец?! Партызан?! Ну?! — дамагаўся адказу жаўнер.

— Не ведаю, — адказаў Янка.

— Не веш?! — падступіўся другі і ўдарыў Янку па твары.

З носа ў Янкі хлынула кроў і ён ніцма ўпаў ля сцяны.

А калі жаўнеры адышлі і над хатай узвіўся клубок чорнага дыму, хлапчук паўзком дабраўся да плоту, непрыкметна праціснуўся ў дзірку і праз агарод пабег да ракі.

Абмыўшы вадою свой абкрываўлены твар, Янка схаваўся ў кустах за аброслым травою абрывам — у некалькіх кроках ад крыніцы, да якой зімой і ўлетку змейкай спускаўся ўніз срэбны струменьчык сцюдзёнай вады.

Неўзабаве ў кусты прыбеглі Аркаша і Толік. Іх пазнаў Янка, калі яны толькі-што скочылі ў абрыву, і адразу паклікаў да сябе.

— Сюды! Сюды, хутчэй!

Хлапчукі спалохаліся і шарахнуліся ў бок.

— Гэта я, я... — шаптаў Янка.

У Аркашы была абпалена левая нага, у Толіка падбіта вока і разарвана кашуля.

Цяпер ужо Янка быў не адзін. Ён павесялеў. З яго носу ўжо не цякла кроў, толькі вельмі ныла ў пераноссі і шчымела ў грудзях.

— Калі бацька жывы, дык усё будзе добра, — гаварыў Янка. — Мы яшчэ ім пакажам, дзе ракі зімуюць... Вось няхай толькі нашы...

Яны ціхенька сядзелі ў кустах. Часам раіліся паміж сабою, а ноч цягнулася доўга-доўга, здавалася, ёй не будзе канца. Вецер гойдаў галінкі, паласкаў зялёныя лісткі, шамацеў чаротам. Маўкліва плыла невялічкая рэчка.

Апоўдні іх лашчыла ліпеньскае сонца, саграваўа сваім пяшчотным цяплом. Пазней зноў казытала рачна прахлада і хлапчукі гуліліся адзін да другога, пазіраючы ў бакі.

А ў вёсцы бліскалі агні, на папялішчах дымілі галавешкі, плакалі, енчылі маленькія дзеці, галасілі жанкі.

Жаўнеры блукалі па вуліцы, гарцавалі на конях, нагружалі вазы, задаволена рагаталі.

К вечару Зарачаны замоўклі. Застаўшымся ў вёсцы было сурова забаронена выходзіць з будынкаў, запальваць агні. Навакол цішыня. Нават буслы і тыя не прыляцелі начаваць у сваю за гэтулькі год аблюбаваную мясціну, ацураліся гнязда, дзесьці засталіся па той бераг ракі за бярэзнікам.

Ля руін і папялішчаў хадзілі ўзброеныя жаўнеры, на ўскраінах зруйнаванай вёскі стаялі пасты, ля маста абапал берагоў сядзела засада.

У хаце кулака Анухрэя балявалі афіцэры і было чутна, як у руках Анухрэевай дачкі дрынчэлі струны гітары.

— Чакай, гадзюка, мы яшчэ пайграем табе!.. — злосна прашаптаў Аркаша, абвязваючы абпаленую нагу шматком сваёй кашулі.

А па лузе, ля кустоў, з вінтоўкай у руках хадзіў патрульны. Ад месячнага святла ў яго збоку блішчэла сабля, за плячыма над галавою тырчэў штых і, калі ён ступаў па траве, у яго звінелі шпоры.

Янка на цыпачках сядзеў у лазе і ўвесь час сачыў за мернаю хадою патрульнага.

— Ён! Той, вусаты! — ціхенька шаптаў Янка Аркашу, пазнаўшы жаўнера, які ўдарыў яго па твары.

— От-бы вінтовачку нам... падумаў Янка: — я-б ураз яго...

Ён прыхінуўся да Аркашы, губамі намацаў яго цёплае вуха і пачаў шаптаць:

— Трэба нам зараз...

Аркаша ў знак сваёй згоды паківаў галавой.

— Толькі як-жа мы?..

— А мы адразу ў трох скочым з кустоў і ўссядзем на яго, я за вінтоўку, а ты з Толікам... скажы яму...

Але Толік не адважваўся, і гэта стрымлівала хлапчукоў.

— Мамачкі, што вы, не здужаем мы... — гаварыў ён.

— Баязлівец! — папракнуў яго Янка: — мы і без цябе тады... — і зноў пачаў раіцца з Аркашам.

Апоўначы патрульны ўзабраўся на абрыў, сеў у калючых дзядах і адтуль пазіраў наўкол.

Было ціха. І ў гэтай панурай цішы чулі хлапчукі як раз-по-разу пазяхаў жаўнер.

— Чуеш? Чуеш ты?! — кранаючы локцем Аркашу, пытаўся Янка.

— Ну, як, Толік, пойдзеш з намі?

Толік зірнуў на Янку і ўрэшце сказаў:

— Пайду!

— Даўно-б так, а то...

Янка кіўнуў галавою і першы падаўся з кустоў, а следам за ім асцярожна пачалі выбірацца хлапчукі.

— Хр-р-р... Хр-р-р-р... — данёсся да вушэй хлапчукоў хроп заснуўшага жаўнера.

Ціцком падкраўшыся да патрульнага, яны раптам з сілаю ўдарылі яму ў спіну.

— Во табе! — прамовіў Янка.

Жаўнер няёмка ўзмахнуў рукамі і грузна плюхнуўся ў крыніцу.

Янка схапіў вінтоўку і хлапчукі адскочылі ўбок.

Яны яшчэ некалькі хвілін назіралі з кустоў і калі ўжо зусім упэўніліся, што жаўнер акачурыўся, пабеглі ў атрад да Янкавага бацькі.

У тую росную ліпеньскую ноч тысяча дзевяцьсот дваццатага года ўзброены Янка разам з партызанскім атрадам ачышчаў вёску Зарачаны ад белых палякаў.

АЛЕСЬ СТАХОВІЧ.



Эскіз «На граніцы» беларускіх скульптараў Глебава і Орлова.

У МЯСТЭЧКУ ЛЮБОНІЧЫ

Мястэчка Любонічы — гэта зусім недалёка ад Бабруйска.

Жнівеньскай ноччу жыхары мястэчка чулі цяжкія водгукі гарматных стрэлаў з боку Бабруйска, бачылі, як палымнела ў водбліскаx пажару неба над Бабруйскам. Жнівеньскай ноччу акупанты снарадамі разрывалі сэрца павета — Бабруйск.

— Хутка... — шаптала местачковая беднага, і ў голасе кожнага чуўся страх. Ды і чаго чакаць? Хіба не даходзяць кожны дзень да мястэчка чуткі аб чыніўшыхся жахах у вёсках, занятых белапалякамі. І хіба не гаварылі людзі аб загадзе, напісаным у Менску, у якім ясна сказана, што «Уся асабістая ўласнасць павінна быць звернута законным уласнікам», што «Памешчыкі ці іх прадстаўнікі абавязаны не пазней 10 верасня ўступіць у правы ўладання сваімі памесцямі». Ці можна пасля гэтага чакаць ад палякаў дабра...

— Хутка... — гаварыў глухім голасам пан Занкевіч і ў дрыжачых кутках яго роту іграла ўсмешка. Пану Зенкевічу ёсць чаму радавацца. У сучасным траціць няма чаго, усё яго лепшае ў мінулым і будучым. Аб будучым гаварыў яму яго сын — прастак яго «благароднай» крыві, які ваюе ў мундзіры польскага афіцэра супроць большэвікоў.

О! Як чакае ён яго звароту. Як надакучыла яму ўсміхацца гэтай расперазанай галоце і нават гэтаму тоўстаму млынару, у якога рукі заўсёды потныя і нос падобны на вярблюдаў горб і які стаіць зараз на другім баку вуліцы і аб чымсьці гаворыць з местачковым равінам Ісрол Гершн Руманавым. Тым не менш Зенкевіч адчыняе вакно і нягучным вокрыкам вітае млынара і равіна з добрай раніцай.

— Не спіцца, пан Зенкевіч?

— Чакаю змен, Ішые Хаім, чакаю, — гаворыць, абапёршыся на падваконнік, Зенкевіч.

— Трэба рыхтаваць сустрэчу, — гаворыць Зельдзін і запытальна глядзіць на Зенкевіча.

Недзе зусім блізка ад мястэчка разарваўся снарад.

— Заходзьце, — паказаў вачыма ў бок калiткі Зенкевіч і зачыніў вакно.

Часці Чырвонай Арміі адыходзілі на Любонічы, Валосавічы, Курганы. Размясціўшыся ў Любонічах, чырвоныя войскі дапамагалі мірнаму насельніцтву наладжваць на выпадак боя абаронныя сховішчы.

Неба пісяжылі польскія самалёты, вышукваючы размяшчэнне чырвоных войск. То тут, то там ірваліся скідваемыя самалётамі запальваючыя бомбы. Ухала артылерыя. Стракаталі кулямёты.

Ноччу з боку вёскі Марзовічы шквалам рынула на мястэчка польская кавалерыя.

Хроп коней, бляск рэжучых паветра сабляў, частакол пік, крыкі коннікаў,— усё гэта злілося ў адным гуку — атака!

Але пільна глядзяць на варожую лавіну чырвоныя кулямётчыкі. Спакойны і самаафярны камандзір кулямётнай каманды першым кідаецца насустрач ворагу, першай куляй забівае імкнучага на яго конніка. Застракаталі кулямёты, паслухмяныя камандзе, радамі скошваючы замітусіўшыхся белапалякаў.

Вораг зматы. Адкінуты.

Гэта быў канец жніўня і пачатак верасня.

Чырвоныя войскі, пад прыкрыццём застаўшыхся ў мястэчку кулямётчыкаў, у баявым парадку адыходзілі на Казулічы.

II.

Касыя праменні заходзячага сонца коўзаліся па дахах хат. Пыл, узняты на вуліцы адыходзячымі чырвонаармейцамі, залацістымі іскаркамі паступова клаўся на зямлю.

Зняліся са сваіх баявых пазіцый апошнія кулямётчыкі.

Дзе-ні-дзе асцярожна адчыняюцца вокны. Нясмелыя постаці людзей паказваюцца ў калітках.

Чырвоныя адышлі. Каля хаты Зельдзіна невялікі натоўп. Гэта мясцовыя крамнікі і кулакі прышлі параіцца аб сустрэчы. Зельдзін дае ўказанні. Натоўп разыходзіцца па дварах. Праз некалькі хвілін уздоўж вуліцы выцягваецца рад сталоў, пакрытых каляровымі і белымі абрусамі. На сталах «хлеб-соль» для дарагіх гасцей.

У мястэчка ўрываецца атрад белапольскіх коннікаў.

— Дзе большэвікі?

— Нема, пане, чырвонага быдла, нікога нема. Мядку, проша пана, пакаштаваць, — вітаюць акупантаў крамнікі і кулакі.

Частка коннікаў рассыпаецца па вёсцы шукаць большэвікоў. Другая частка спешваецца і падыходзіць да сталоў.

Насельніцтва выходзіць на вуліцу. Небяспечна ў гэты час сядзець дома. Акупанты, «накаштаваўшыся» ля сталоў, напрамкі несліся то да адной, то да другой хаты.

Западазроных у спачуванні большэвікам арыштоўвалі, білі шампаламі і бізунамі.

Зельдзін здаволены. На сталах гара ўсемагчымых страў, можна наесціся і ў кішэню ўзяць. Паціскаюць акупанты потную руку Зельдзіна: добры прыём.

На ўскраіне мястэчка, каля лясніцтва, акупанты злавілі чырвонаармейца. Білі, здзекваліся.

Пасля ўсяго галопам пусцілі коней па целу афяры, пакінуўшы ляжаць распасцёртае змятае цела на дарозе.

Да месца здарэння, цягнучы дарослых, паімчаўся натоўп дзяцей. Разам з усімі бег і Шая Вільнер. Шаю 14 год. Шмат што цікава хлопчыку. Дапытлівасць перамагае страх.

Па дарозе бягучых сустрэў эскадрон коннікаў.

— Стой!.. — натоўп абкружылі.

— Большэвікі?

— Любоніцкія мы, жыхары... — нераш учча адказаў хтосьці з натоўпу.

— А!.. — з надрывам выкрыкнуў афіцэр. Выкрык паслужыў камандай. Бізуны з цяжкімі валавянымі наканечнікамі апусціліся на спіны дзяцей і дарослых...

Паводзіны афіцэра не былі беспрычыннымі. Усяго некалькі хвілін назад эскадрон быў абстралян чырвонымі з казуліцкага лесу, у рэзультаце чаго яму прышлося павярнуць на Любонічы.

Шая Вільнер выбег з натоўпу раней, чым яго абкружылі белапалякі: «Страшна бачыць гэтых імкнучых на ўсім скаку коннікаў»...

Бягучага хлопчыка заўважылі: «Пэўна большэвік, папярэдзіць сваіх бяжыць». Два коннікі аддзяліліся ад натоўпу.

— Стой!

Пачуўшы вокліч, Шая пабег яшчэ хутчэй: «Дамоў, хутчэй дамоў, дома мама, дома не крануць».

— Стой! — закрычаў адзін з белапалякаў і шыбануў наўздагад бягучаму хлопчыку піку.

Шая адчуў, як штосьці ўдарыла ў шыю, як па спіне пабеглі цёплыя струмені, пахіснуўся, але не ўпаў. Перад вачыма дом, калітка. Шая ўбягае ў кватэру, з гучным лямантам — «мама»! — хаваецца пад ложак.

Следам за ім у кватэру ўрываюцца салдаты, выцягваюць хлопчыка з-пад ложка, вывалакваюць на вуліцу. Да самага сэрца маці іравецца голас, родны голас яе хлопчыка. Затым стрэл, хуткі тупат і цішыня...

Мёртвая цішыня наступаючага вечара. Жыхары распаўзліся па хатах. Бязгучна рыдала маці над стынучым целам хлопчыка.

Каля лясніцтва сярод маладых ёлак ляжаў труп. Толькі па шлему можна было даведацца, што гэта чырвонаармеец.

Ал. ШАРАПАЎ.

СУЗОР'Е МАСТАЦКІХ ТАЛЕНТАЎ

Вызваленая ў 1920 годзе Чырвонай Арміяй ад белапольскіх акупацыйных банд, Совецкая Беларусь пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна закрасавала буйнымі ўсходамі народных талентаў.

Подлыя ворагі народа — трацкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія здраднікі і двурушнікі, якія доўгія гады арудавалі на фронце мастацтва і літаратуры БССР, засмечвалі мастацкія кадры варожым бур'янам і чорта-палохам, імкнуліся заглушыць рост таленавітых мастакоў з нетраў народа. Але ворагі пралічыліся. Шалёныя фашысцкія сабакі выкрыты і выкарчаваны слаўнай совецкай разведкай, кіруемай сталінскім наркомам Н. І. Ежовым. Совецкая разведка, абапіраючыся на шматмільённы шчаслівы народ, выкарчуе варожае ахвосце да канца, у якіх-бы закутках яно ні хавалася.

У барацьбе супроць ворагаў народа, за соцыялістычнае мастацтва растуць і квітнеюць беларускія мастацкія кадры. Беларускі совецкі тэатр з дапамогай старэйшай і вядучай рускай тэатральнай культуры выхаваў плеяду майстроў, здольных ствараць высокаякаснае сцэнічнае мастацтва. Нават на прыкладах росту асобных актораў беларускага тэатра можна ўбачыць росквіт сцэнічнага мастацтва ў Совецкай Беларусі і яго творчых кадраў.

Апрача Л. П. Александроўскай, у сценах Беларускай кансерваторыі і опернай студыі вырасла спявачка—лірыка-каларатурнага сапрана Доча Кроз. Валодаючы мілагучным і прыемным голасам і досыць высокай для яе ўзросту каларатурнай тэхнікай, артыстка Кроз шмат працуе і над сцэнічным малюнкам вобразаў. Артыстка стварыла цікавыя вобразы Джыльды ў оперы «Рыгалета» і Разіны ў «Севільскім цырульніку». Дона Кроз часта захапляе слухачоў у сваіх цікавых выступленнях на эстрадзе. Уласцівасцю даравітай артысткі, што забяспечвае ёй няспынны творчы рост, — з'яўляецца ўпартая работа над вобразам, над арганічным спалучэннем музыкальнай фактуры партыі з эмацыянальна-выразным сцэнічным малюнкам.

Надзвычайнымі прыроднымі вакальнымі данымі валодае і другая выхаванка Беларускай музыкальнай школы С. Друкер. Яна валодае драматычным сапрана вялікай сілы і шырокага дыяпазону. Значныя вакальныя магчымасці Друкер былі прадэманстраваны ёю яшчэ пры выкананні партыі Яраслаўны ў оперы «Князь Ігар» і Ларынай у оперы «Еўгеній Онегін». Працуючы з рэжысёрам Златагоравым і дырыжорам Шнейдэрманам над партыяй Тоскі ў оперы «Флорыя Тоска» — Пучыні, артыстка паказала далейшы рост вакальнага і сцэнічнага майстэрства.

Каларытная, творчая фігура ў Оперным тэатры артыст М. Дзянісаў. Лірыка-драматычны барытон Дзянісаў — перадавы змагар у тэатры з опернай вампукай, за драматычную выразнасць і музыкальную насычанасць вобраза. Сярод галерэі створаных ім цікавых вобразаў асабліва вылучаецца сваім драматызмам партыя Рыгалета ў аднайменнай оперы Вердзі. Артыст з поспехам працаваў над вобразам Лісніцкага ў оперы «Ціхі Дон».

Яркая фігура ў Беларускім тэатры оперы і балета — вядучая салістка балета А. Нікалаева. Прыехаўшая ў 1933 годзе з Ленінграда ў Совецкую Беларусь, яна вырасла ў нашым тэатры ў буйную артыстку. Нікалаева з першых дзён свайго знаходжання ў тэатры вяла прынцыповую барацьбу з саматужніцкай «сістэмай» балетмейстара Крамарэўскага, за высокую культуру балетнага актора, за вучобу ў лепшых майстроў рускага класічнага і совецкага балета. Нікалаева—артыстка вялікага абаяння, удумлівая і надзвычайна эмацыянальная. Яна заўсёды імкнецца насыціць танцавальны вобраз драматычным зместам, разумеючы, што высокая танцавальная тэхніка балерыны павінна быць падпарадкавана стварэнню поўнацэннага мастацкага вобраза.

З нетраў нашага народа вырас у таленавітага танцоўшчыка артыст С. Драчын, які валодае надзвычайнымі знешнімі данымі і каларытным танцавальным тэмпераментам.

Творчы шлях рэжысёра і артыста Л. Г. Рахленкі вельмі тыповы для многіх таленавітых майстроў беларускага совецкага тэатра.

Прывабны і разумны актор Л. Г. Рахленка праявіў вялікія здольнасці ў галіне акторскага майстэрства і асабліва ў галіне рэжысуры. Вельмі паказальным для творчага профіля актора і рэжысёра з'яўляецца яго работа над спектаклямі «Ваўкі і авечкі» і «Партызаны». Нацыянал-фашысты, якія арудавалі на фронце мастацтва, распаўсюджвалі варожую тэорыйку, што руская класіка нібы не зразумела беларускаму гледачу. Глыбока рэалістычным спектаклем «Ваўкі і авечкі» Рахленка на практыцы давёў вялікую даходчывасць да беларускага гледача твораў геніяльнага рускага драматурга А. Н. Остроўскага, як і іншых рускіх класікаў. Работа Рахленкі над «Партызанамі» і п'есамі іншых беларускіх совецкіх драматургаў садзейнічала і садзейнічае росту беларускай совецкай драматургіі.

Артыст Краўцоў належыць да маладога пакалення актораў Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра. На яго прыкладзе відаць шлях перадавой акторскай моладзі тэатра. Прарываючыся праз фармалістычную тканіну спектакля «Жакерыя», амаль яшчэ дэбютант Краўцоў стварыў цікавы вобраз галоднага героя драмы Мерымэ—Жана, паказаўшы творчую спеласць і падрыхтаванасць для работы над буйнымі сцэнічнымі вобразамі. Пасля «Платона Крэчэта», дзе артыст вельмі выразна іграў ролю галоўнага ўрача больніцы, ён выступае ў вобразе шпіёна Келлера ў «Вочнай стаўцы». Па-майстэрску, крок за крокам, Краўцоў раскрывае двурушніцка-здрадніцкае аблічча хітра замаскіраванага ворага, які, ненавідзячы совецкі народ, багата нашкодзіў нашаму народу.

Малады артыст Бараноўскі прыцягнуў да сябе ўвагу гледача яшчэ ў той час, калі ён іграў ролю Мозэса ў п'есе Бруштэйн «Працяг будзе». Актор у вобразе Мозэса вабіў шчырасцю і праўдай пачуццяў, якая ідзе ад мастацкай прастаты работы над вобразам і прыроднай даравітасці актора. Сакавіты, рэалістычны тэмперамент актора ніколі не пераходзіць мяжы, за якой пачынаецца шэрая бытаўшчына. І таму нават эпізадычная роля, якую іграў Бараноўскі ў «Салаўю», цікава выяўленнем уласцівай актору прастаты і праўдзівасці. Сур'ёзная ўдача Бараноўскага ў «Партызанах» (дзед Бадыль) падрыхтавана ўсёй папярэдняй творчай работай маладога таленавітага актора.

А. К. Ільінскі і П. С. Малчанаў, як майстры сцэны, сфарміраваліся ў совецкім тэатры, заняўшы ганаровае месца ў сям'і лепшых актораў беларускіх тэатраў. Сыграўшы вялікую колькасць ролей, пераважна камедыйнага плана, завяршыўшы гэты цыкл роляю Швандзі ў «Любові Яравой», А. К. Ільінскі ў вобразе Владзіміра Дуброўскага паказаў сябе акторам яркага рамантычнага тэмпераменту. Пасля манументальнага драматычнага вобраза Талаша Ільінскі заканамерна прышоў да вобраза Бессеменава ў «Мяшчанах»—Горкага. А. К. Ільінскі—актор рознастайнага сцэнічнага тэмпераменту і мастацкай культуры.

П. С. Малчанаў, пасля доўгага перапынку, надзвычайна ўдала, з разумным гумарам сыграў бытавую ролю селяніна ў вадэвілі Янкі Купалы «Прымакі». Гумарыстычны тэмперамент актора дапамог яму стварыць цікавы вобраз партызана Дарвідошкі ў п'есе Коласа «У пушчах Палесся». Малчанаў перадае пачуцці сваіх герояў з вялікай страсцю. Асноўная тэма інтэрпрэтацыі Малчанавым вобраза белагвардзейскага паручыка Яравога — паказ лютай нянавісці гэтага бязмежнага падлюгі і здрадніка да нашага народа. Лейтматыў, вядучая тэма вобраза данесена акторам з гранічнай эмацыянальнай выразнасцю. Следчы Ларцаў у інтэрпрэтацыі Малчанава палкі і мужны совецкі патрыёт, уся дзейнасць і ўсё жыццё якога насычаны аптымізмам і героікай нашага вялікага народа. Разумны актор, які валодае майстэрствам глыбокага пранікнення ў філасофскую сутнасць вобраза, Малчанаў вырас для творчай работы над вобразам вялікага Леніна, якая яму даручана ў спектаклі «Чалавек з ружжом» у Віцебскім тэатры.

Артысты Ю. Арончык і Я. Трэпель характэрны перш за ўсё тым, што праз нацыяналістычна-фармалістычны змест і форму многіх спектакляў Яўрэйскага тэатра яны пранеслі рэалістычны стыль акторскай ігры, сваёй творчай практыкай змагаючыся, амаль у кожным спектаклі, з варожымі ўстаноўкамі былога мастацкага кіраўніка тэатра. Вельмі часта гэта адбывалася нават стыхійна, таму што штукарства і фармалістычныя выкрунтасы чужды сапраўдным талентам.

Ю. Арончык сыграла ў тэатры вялікую колькасць ролей. У яе актыве справядліва лічыцца драматычны вобраз Лаўрэнсіі, сакавіты і камедыйны вобраз Мірандаліны, наіўнай і шчырай жанчыны эпохі англійскага рэнесанса («Вольпонэ»), Рохеле ў «Рэкруце», маці Овадзіс і паэтычная Авігаіл у музыкальнай паэме «Суламіф». Асноўная ўласцівасць артысткі — сцэнічная прывабнасць, шчырасць пачуццяў, псіхалагічная глыбіня і правільнасць сцэнічнага рысунку, адсутнасць фальшы і наігрышу.

А. Трэпель — актор своеасаблівага камедыйнага таленту і тэмпераменту. Іграючы пераважна камедыйныя ролі, ён раскрывае кожны вобраз уласцівымі для яго фарбамі — будзь гэта сладастрасны скнара Карбачыо, «чалавек паветра» Менахем Мендл, ці нескладны жаніх з «Суламіфі».

Уласцівасці Арончыка і Трэпеля ў той ці іншай меры мы знаходзім у цэлай групе актораў Яўрэйскага тэатра.

Работа артыста Д. А. Орлова ў Рускім тэатры БССР праходзіць ва ўмовах творчага росквіту вялікага майстэрства актора, які прынёс у Рускі тэатр БССР культуру маскоўскай сталічнай рускай сцэны. Галерэя тыпаў, якія створаны Орловым, багатая і рознастайная. Тут і класічны вобраз Хлестакова, якога Орлоў іграе ў арыгінальнай свежай трактоўцы, і горкаўскі Пратасаў — сумленны і шчыры, непасрэдны і дзівакаваты, просты і бескарыслівы. У палітры Орлова знайшлося дастаткова фарбаў для абрысоўкі разумнага і здаровага гумару Лепарэлла, драматызму чароўнага гераічнага маладога чалавека совецкай эпохі Паўкі Карчагіна.

У сузор'і мастацкіх талентаў яркімі зоркамі свеціць маладзейшае пакаленне актораў, выхаванцаў совецкай тэатральнай школы апошніх гадоў.

Былатная балерына А. Васільева, якая віртуозна валодае мастацтвам класічнага танца, адароная драматычная актрыса Браварская, маладыя растучыя артысты Чэмелаў і Фрыдман, артыстка пранікнёнага лірычнага тэмпераменту Басінкевіч, рэжысёр Ю. Г. Палічынецкі і шмат іншых юных работнікаў беларускай сцэны — квітнеючыя таленты совецкага народа, якія выхаваны няспыннымі клопатамі камуністычнай партыі аб мастаках совецкага народа.

Паказаныя намі асобныя прыклады творчага росквіту кадраў мастацтва адлюстроўваюць лёс і аблічча дзесяткаў і соцень работнікаў совецкага тэатра, вырасшых за годы рэвалюцыі.

Сузор'е мастацкіх талентаў у самай шчаслівай у свеце соцыялістычнай краіне пышна расцвітае пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Ф. МІХАЙЛАЎ.



А. Ільінскі. С. Краўцоў. Ю. Палічынецкі. С. Друкер. Л. Рахленка. А. Трэпель. М. Дзянісаў. Д. Орлоў. А. Нікалаева. С. Драчын. Ю. Арончык. В. Чэмлоў.

НА СХОДЗЕ КАМПАЗІТАРАЎ

7 ліпеня адбыўся агульны сход Саюза савецкіх кампазітараў БССР. Са справаздачным дакладам аб рабоце аргбюро саюза выступіў адказны сакратар яго тав. Любан. Крытыкуючы свае памылкі, ён сказаў, што вынікам яго дрэннай работы з'яўляецца нежаданне кіруючых органаў, у прыватнасці Упраўлення па справах мастацтваў, па-дзелавому дапамагаць саюзу ў яго рабоце. Ен спасылаўся на тое, што кампазітары таксама не заўсёды яму дапамагалі. Нам здаецца, што не ў гэтым прычына яго бяздзелля, а ў тым, што тав. Любан не здолеў арганізаваць работы, што ён не шчыльна быў звязан з кампазітарамі, не заўсёды прыслухоўваўся да іх голасу, таму не змог арганізаваць саюз як арганізацыю, мала аддаваў увагі стварэнню творчай атмасферы ў саюзе. Да некаторай ступені стыль работы тав. Любана характарызуе безгаспадарчасць, якая пануе ў фінансавых справах саюза, аб чым далажыў сходу старшыня рэвізійнай камісіі кампазітар тав. Аладаў.

Крытыка работы аргкамітэта больш шырока разгарнулася ў спрэчках, у якіх прынялі ўдзел амаль усе прысутнічаўшыя члены саюза. У спрэчках выступілі дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР кампазітары тт. Багатыроў і Туранкоў, кампазітары тт. Пукст, Палонскі, Крошнер, Лукас, Цікоцкі, Ефімаў, Самохін, Іваноў, Равенскі, Рыбкін, Аладаў.

Выступаючыя таварышы адзначылі, што юрыдычна Саюза совецкіх кампазітараў, як таварыства працоўных, не існуе, таму што ў яго да гэтага часу няма статута, невядома, хто мае права быць яго членам, а хто не мае.

Дрэнна абстаіць справа з папулярызацыяй твораў беларускіх кампазітараў. Кампазітары заяўляюць, што яны не ведаюць творчасці адзін другога. Аргкамітэт не здолеў арганізаваць прасоўвання новых твораў сваіх кампазітараў у масы. Філармонія і Радыёкамітэт мала клапоцяцца аб выкананні твораў беларускіх кампазітараў. А Выдавецтва БССР нават выжыла кампазітара Ефімава з музыкальнага сектара, хоць ён нядрэнна быў наладзіў справу выдання твораў беларускіх кампазітараў. Аргкамітэт не клапаціўся аб членах саюза, а часта нават не ведаў, хто над чым працуе.

— Стары аргкамітэт распаўся, — гаворыць тав. Багатыроў. — Адказны сакратар бяздзейнічаў. Неабходна наладзіць творчую работу такім чынам, каб кожны кампазітар браўся за тое, што яму па сілах. Саюз павінен дапамагаць сваім членам перш за ўсё ў творчай рабоце. Гэты год асабліва важны, таму што мы ўсе рыхтуемся да дэкады беларускага мастацтва. А гэта абавязвае нас працаваць толькі добра. І людзі, якіх мы абярэм у кіраўніцтва саюза, гэтага не павінны забываць.

Тав. Туранкоў адзначыў, што аргкамітэт не стварыў сабе аўтарытэту, таму што нічога не рабіў.

— Трэба не спасылацца на тое, што секцыі нічога не рабілі, —гаворыць тав. Аладаў, — а арганізаваць работу гэтых секцый. Вось у чым павінна была быць асноўа работы тав. Любана.

Работы секцый — абароннай, творчай і крытычнай амаль не было. Калі і ёсць некаторыя дасягненні ў галіне стварэння першых беларускіх опер, выдання зборніка беларускіх песень, дык у гэтым заслуга не аргкамітэта і нават не саюза, а асобных кампазітараў, якія, дзякуючы энергічнай, плённай рабоце, нягледзячы на ўсе непаладкі ў саюзе, усё-ж працуюць паспяхова.

Зусім не арганізавана крытычная работа.

Няма ніякай палітычна-выхаваўчай работы.

Дрэнна ідзе падпіска на Пазыку трэцяй пяцігодкі (выпуск першага года).

Не арганізавана справа павышэння кампазітарскай кваліфікацыі.

Вось асноўныя хібы, якія чакаюць неадкладнага выпраўлення. І гэта могуць зрабіць не паасобныя кіруючыя таварышы. Неабходна ўсім кампазітарам узяцца за справу выпраўлення памылак.


У рэзалюцыі, якую прыняў агульны сход, работа старога аргкамітэта прызнана нездавальняючай. Для таго, каб аздаравіць работу кампазітараў, неабходна ў самы бліжэйшы час стварыць саюз і даць яму юрыдычнае права існавання. Неабходна выпрацаваць статут. Усю творчую працу трэба сканцэнтраваць у напрамку падрыхтоўкі да беларускай дэкады, да якой засталося ўжо менш года, бо поспех дэкады залежыць ад падрыхтаванасці ўсіх работнікаў мастацтваў. І Упраўленне па справах мастацтваў, якое мала дапамагае саюзу, гэта становішча павінна ўлічыць.

У канцы схода тайным галасаваннем быў абран новы аргкамітэт Саюза совецкіх кампазітараў БССР, у які ўвайшлі дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тт. Багатыроў і Туранкоў, кампазітары тт. Аладаў, Ефімаў і Шнэглоў. Адкрытым галасаваннем абраны два кандыдаты ў члены аргкамітэта— кампазітары тт. Цікоцкі і Пукст.

***

На першым пасяджэнні новага аргкамітэта Саюза совецкіх кампазітараў БССР адкрытым галасаваннем аднагалосна старшынёй саюза абран тав. Багатыроў, адказным сакратаром саюза абран тав. Ефімаў.

А. Е.



Від вуліцы імя Карла Маркса ў Менску. Фота Каплінскага.

НОВЫЯ РАБОТЫ КАМПАЗІТАРА А. Е. ТУРАНКОВА

Кампазітар А. Е. Туранкоў, натхнёны вялікім усенародным святам — выбарамі ў Вярхоўныя Советы саюзных і аўтаномных рэспублік, напісаў дзесяць новых масавых песень. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца песні «Аб Сталіне сейбіту» — на тэкст Я. Купалы, «Ой, шумі ты, радуйся, беларускі бор», «На золаку рана конь заржаў» і «Сустракай, мая краіна» — на словы калектыўнай паэмы беларускіх паэтаў «Радзіме і правадыру». Памянёныя творы выконваліся ў часе выбарчай кампаніі, выконваюцца і зараз хорам Дзяржаўнай філармоніі БССР і салістамі Беларускага радыёкамітэта.

Ведучы грамадскую работу сярод выбаршчыкаў Менска, якія аказалі тав. Туранкову вялікае давер'е, абраўшы яго дэпутатам у Вярхоўны Совет БССР, ён не раз чуў, што шматлікія музычныя калектывы, асабліва духавыя аркестры, амаль не выконваюць арыгінальных музычных твораў на тэмы беларускіх народных песень. Ен вырашыў, што такія творы неабходна стварыць. І ён стварыў іх. Зараз ужо аркеструецца яго мантаж з беларускіх народных песень і танцаў для самадзейных духавых аркестраў. У мантаж увайшлі вядомыя беларускія песні «Лянок», «Палыночак», «Чаму-ж мне не пець» і танцы «Крыжачок», «Лявоніха» і інш. Безумоўна, што гэты мастацкі твор з ахвотай будуць выконваць нашы духавыя аркестры. Дом народнай творчасці БССР павінен шырока папулярызаваць мантаж сярод удзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Кампазітарам сабран беларускі фальклор і зроблены чарнавыя накіды сюіты, зноў-такі на тэмы беларускіх народных песень і танцаў. Сюіту Туранкоў піша па заказу аркестра народных інструментаў Саюза ССР. Гэтую работу ён мяркуе закончыць да 1 жніўня гэтага года.

Адначасова тав. Туранкоў працуе над музыкай для фільма «Вогненыя годы», які прысвячаецца барацьбе працоўных Беларусі з белапольскімі акупантамі. Заканчэнне гэтай работы залежыць ад таго, як хутка фабрыка «Совецкая Беларусь» падрыхтуе фільм.

Кампазітар намеціў напісанне оперы з жыцця пагранічнікаў, лібрэта для якой піша пісьменнік І. Шапавалаў.



Гобелен «Калгасніца з яблыкамі». Мастацкая вышыўка Г. Струпінай.

„ОТЭЛЛО“

У Одэскім тэатры Рэволюцыі

«Отэлло» — не трагедыя пра рэўнасць, як гэта сцвярджалі многія крытыкі і літаратуразнаўцы. Любоў Отэлло да Дэздэмоны і каварства Яго, асабістая трагедыя Отэлло перарастае ў соцыяльны канфлікт і набывае абагульняючае значэнне. Трагедыя ўскрывае складаны працэс станаўлення новай маралі і новай этыкі на рубяжы двух гістарычных эпох.

Отэлло — чалавек эпохі Рэнесанса. Ен — сапраўдны гуманіст, горды і сумленны, прастадушны і адважны, які ўласнай мужнасцю пракладае сабе шлях у жыццё, — заваёўвае да сябе агульную павагу і чыстае, шчырае каханне Дэздэмоны. «Она за бранный труд мой полюбила» — гаворыць Отэлло аб прычынах кахання Дэздэмоны, а ён яе за «сострадание» пакахаў. Отэлло поўны чалавечага благароднства і вялікай веры ў жыццё і людзей «Отэлло ад прыроды не раўнівы — наадварот: ён даверлівы» — пісаў Пушкін. Отэлло з'яднала з Дэздэмонай глыбокае ўзаемнае разуменне і надзвычайныя маральныя якасці гераіні. Іх каханне — пачуццё высокай маральнай годнасці.

І калі, пасля доўгіх бясплодных намаганняў, Яго ўдалося пахіснуць бязмежную веру Отэлло ў Дэздэмону, Отэлло быў узрушан і зняважан распадам маральнай асновы саюза кахаючых сэрцаў, якая грунтавалася на абсалютнай праўдзівасці і ўнутраным зблізкэнні. Ілжывасць Дэздэмоны, якая была «даведзена» Отэлло «сумленным» Яго, — прычына гібелі благароднага венецыянскага маўра.

Яго — не менш яркая фігура ў трагедыі, чым Отэлло, — ён стрыжань усіх трагічных канфліктаў. Яго паходзіць з нізоў. Гэта салдат, агрубеўшы ў доўгалетніх войнах, разумны, энергічны і таленавіты чалавек. Але ён інтрыган, які кіруецца ў жыцці воўчымі прынцыпамі нараджаючагася капіталізма. «Добрае імя — нікчэмны і зусім ілжывы цяжар» — кажа Яго. Разлік і выгода — аснова жыцця, і для дасягнення сваёй выгоды ўсе сродкі добрыя. Двоедушнасць — аснова яго маральнага кодэксу.

Сутычкі Отэлло і Яго — барацьба двух светапоглядаў, якія адпавядаюць двум напрамкам ідэалогіі эпохі.

Спектакль «Отэлло» ў Одэскім тэатры Рэволюцыі пастаўлен удумліва. Радуе зрок манументальнае афармленне мастака Шаблюўскага, які несумненна адчувае эпоху і добра адлюстроўвае Венецыю. У музыцы кампазітара Данькевіча шмат драматызму і паўднёвага каларыту — асабліва ў народнай сцэне на Кіпры. Калі і можна чым-небудзь папракнуць кампазітара, дык хіба тым, што лірычная тэма Дэздэмоны, яе трагічная асуджанасць эмацыянальна недастаткова падкрэслена.

Нам здаецца спрэчнай трактоўка галоўных персанажаў спектакля пастаноўшчыкам І. Я. Юхіменка і акторамі, якія выконваюць вядучыя ролі.

Ролю Отэлло іграе засл. арт. рэсп. І. Ф. Маяк. Артыст валодае ўсімі данымі, якія неабходны для выканання ролі. Аднак, ён іграе Отэлло няроўна і ў многім, як нам здаецца, няправільна. Першы акт у «Отэлло» пабудаван на нараджэнні кахання Отэлло і Дэздэмоны. Лірычная тэма «Отэлло» інтэрпрэтыруецца акторам без дастатковай унутранай усхваляванасці і ўскрыцця паэзіі чыстага, бескарыслівага кахання. Палітра фарбаў актора вельмі абмежаваная ў лірычных сцэнах. Актор іграе занадта спакойна і павольна — ён часам коўзае па паверхні пачуццяў. Славуты маналог Отэлло ў сенаце дзякуючы такой манеры ігры не гучыць з той шэкспіраўскай сілай, якая ўласціва маналогу.

У працэсе разгортвання трагічных канфліктаў і нарастання драматызму вобраза Маяк пераходзіць да рэзкіх прыёмаў ігры. Ен пачынае весці ролю ў занадта гучным танальным малюнку, з залішне размашыстымі жэстамі і рухамі. Знешняе аблічча актора, які ўзрушан «здрадай» Дэздэмоны, у такі момант нагадвае буйнага псіхічнага хворага. Тут актор часам, насуперак навучанню Шэкспіра, «ірве страсць у кавалкі». А раздзіраючыя душу сумненні, узрушэнне ад мнімых агідных учынкаў Дэздэмоны можна было перадаць больш мастацкім шляхам, глыбокім **унутраным** раскрыццём хвалюючых перажыванняў Отэлло.

Артыст П. П. Кісялевіч іграе Яго некалькі спрошчана. У такой інтэрпрэтацыі цяжка ўспрыняць Яго як вобраз шэкспіраўскай класічнай трагедыі. Адна яркая фарба дамініруе ў ігры Кісялевіча — плутаўство і грубае інтрыганства, якое больш уласціва вобразам класічнай камедыі. Нават і пластычны малюнак вобраза Яго — яго незвычайная рухавасць і лёгкасць — набліжае вобраз да камедыйнага стылю.

Мякка і стрымана іграе артыстка Загаранская ролю Дэздэмоны. Шчырая і бязмежная адданасць Дэздэмоны Отэлло — найбольш удалыя элементы ў ігры Загаранскай. Менш ярка артыстка адлюстроўвае мужнасць і гордасць венецыянкі.

Эмілія сыграна артысткай Вашчанка недастаткова глыбока і ўдумліва. Прыемнае ўражанне пакідаюць выкананне ролі Кассіо артыстам Возіянам і ролі Б'янкі артысткай Дамброўскай.

Спектаклем «Отэлло» Одэскі тэатр Рэволюцыі яшчэ не паказаў правільнага асваення класічнай спадчыны Шэкспіра.

М. МОДЭЛЬ.

Ф. ВЫХАДЦАЎ

Адлюстраваць веліч эпохі

У дарэволюцыйнай Беларусі мастакі налічваліся адзінкамі, жылі ў розных гарадах, не мелі сваёй арганізацыі і былі пазбаўлены самых элементарных умоў для творчага развіцця. Іх мастацтва несла на сабе адбітак правінцыялізма і адсталасці. Многія з іх былі прымушаны падрабляцца пад густы мяшчанства і правінцыяльнага царскага чыноўніцтва. Толькі нямногія змаглі захаваць свой творчы твар і лепшыя мастацкія традыцыі.

Яркім прадстаўніком гэтай часткі мастакоў быў Юрый Майсеевіч Пэн, які, нягледзячы на ўсе цяжкасці творчага развіцця ва ўмовах царскага рэжыму, змог сапраўднымі мастацкімі сродкамі адлюстраваць быт і цяжкое становішча яўрэйскай беднаты ў дарэволюцыйным беларускім мястэчку.

Аднак мастакі, падобныя Ю. М. Пэну, былі рэдкім з'явішчам на агульным фоне адсталасці. Мастацтва прыгнечанай ускраіны, якой з'яўлялася дарэволюцыйная Беларусь, не магло развівацца і было асуджана на жалкае гібенне.

Толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, пры ўдзеле шырокіх працоўных мас, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі пачаўся сапраўдны росквіт выяўленчага мастацтва ў Беларусі.

У першыя годы рэволюцыі, у перыяд ваеннага комунізма пад сцягам «левізны», прыкрываючыся ілжывай рэволюцыйнасцю, выступае рад фармалістычных кірункаў (футурызм, экспрэсіянізм, супрэматызм і г. д.) на чале з мастакамі Шагалам, Малевічам, Пуні і інш. У супрацьлегласць гэтаму чужому пролетарыяту мастацтву развіваецца маладое, палітычна завойстранае мастацтва шырокіх народных мас, якое адгукаецца на запросы эпохі і прымае актыўны ўдзел у барацьбе за ўмацаванне дыктатуры пролетарыята. Гэты рух выявіўся ў арганізацыі пры палітаддзелах армій выяўленчых студый і гурткоў у абслугоўванні РОСТ'а і. г. д.

Абвайстрэнне класавай барацьбы ў перыяд рэканструкцыі прыводзіць да актывізацыі варожых пролетарыяту элементаў і ў галіне выяўленчага мастацтва. Класава-варожыя праявы ў выглядзе фармалізма розных колераў і адценняў. Буржуазныя нацыяналісты праз сваіх «тэарэтыкаў» мастацтва Шчэкаціхіна, Каспяровіча і інш. імкнуліся авалодаць выяўленчым мастацтвам Беларусі, як адным з участкаў культурнага фронта. Праблема нацыянальнага стылю ператварылася ў іх руках у шырму для ажыццяўлення контррэволюцыйных замыслаў.

Прыкрываючыся лозунгам нацыянальнай «самабытнасці», нацыянал-фашысты вялі заўзятую барацьбу супроць зблізкэння беларускага мастацтва з рускай культурай. У той-жа час яны арыентыравалі ўвагу мастакоў на буржуазны Захад, што было непасрэдна звязана з іх контррэволюцыйнай палітыкай, накіраванай на рэстаўрацыю капіталізма шляхам фашысцкай інтэрвенцыі.

У барацьбе з буржуазнымі нацыяналістамі раслі і мацнелі кадры совецкіх мастакоў Беларусі.

У 1933 годзе быў створан Саюз совецкіх мастакоў. Пастановы і ўказанні партыі дапамаглі совецкім мастакам Беларусі павесці рашучую барацьбу супроць буржуазнага нацыяналізма і стаць на шлях стварэння совецкага рэалістычнага мастацтва, прасякнутага інтэрнацыяналізмам.

Беларускія мастакі ўступілі ў цеснае садружаства з мастакамі братніх рэспублік і народнасцей Саюза ССР. Аб гэтым сведчыць рад такіх фактаў, як арганізацыя выстаўкі беларускага мастацтва ў Маскве, спаборніцтва беларускіх мастакоў з мастакамі Совецкай Грузіі, прыезд у Совецкую Беларусь творчых арганізацый мастакоў Масквы, кантрактацыя беларускіх майстроў «Всекохудожником», паездка беларускіх мастакоў у Кіеў для азнаямлення з украінскім мастацтвам, наведанне выстаўкі грузінскага мастацтва ў Маскве і г. д. Такім чынам сучаснае мастацтва БССР развіваецца як частка мастацтва саюзнага, у шчыльным таварыскім яднанні з мастацтвам братніх народнасцей СССР.

Беларускае мастацтва налічвае ўжо рад буйных майстроў. Кадры беларускіх совецкіх мастакоў інтэнсіўна папаўняюцца маладымі свежымі сіламі, таленавітай моладдзю

Віднае месца ў беларускім мастацтве займаюць жывапісцы: В. В. Волкаў, І. О. Ахрэмчык, Н. А. Пашкевіч, Л. М. Лейтман, Ф. Фогт; скульптары: М. А. Керзін, А. В. Грубэ, А. М. Бразэр, З. І. Азгур, А. О. Бембель; графікі: Б. Е. Малкін, А. Н. Тычына і інш. Мастак Н. І. Гусеў працуе як у галіне жывапісу, так і ў галіне графікі. Трэба адзначыць пейзажыстаў В. Н. Кудрэвіча і Н. В. Дучыца, якія шмат папрацавалі над беларускім пейзажам. Шмат год працуе ў Беларусі жанрыст Г. С. Віер. У апошнія годы праявілі сябе, як здольныя жывапісцы маладыя мастакі Е. Е. Красоўскі, М. І. Манасзон, К. М. Касмачоў, І. А. Давідовіч, скульптары Глебаў, Орлоў і інш.

Вытокі творчага развіцця беларускіх мастакоў розныя. У асноўным, у асаблівасці ў адносінах старэйшага пакалення мастакоў, можна наглядаць дзве лініі гэтага развіцця, якія часам пераплятаюцца з іншымі ўплывамі. Адна частка мастакоў адштурхоўваецца ад традыцый акадэмізма і класіцызма, другая — звязана з рознымі плынямі навейшага заходне-еўрапейскага мастацтва. У сучасны момант мастакі розных творчых груповак ахоплены адзіным рухам — пошукамі форм, якія-б адпавядалі патрабаванням соцыялістычнага рэалізма. Кожны з мастакоў ідзе да ажыццяўлення гэтай задачы сваім шляхам.

М. А. Керзін у сваім творчым развіцці ідзе да рэалістычнага мастацтва праз крытычнае асваенне класічнай спадчыны. Асноўная заслуга М. А. Керзіна ў яго педагагічнай дзейнасці. Значны процант маладых беларускіх скульптараў — яго вучні. М. А. Керзін працуе ў Беларусі з 1923 года і з'яўляецца адным з арганізатараў Віцебскага мастацкага вучылішча. Тав. Керзін займаўся педагагічнай дзейнасцю да 1933 года.

Пасля гэтага ім праароблена вялікая работа па скульптурнаму афармленню Дома Урала, дзе ён узначаліў творчую брыгаду маладых мастакоў. Асабіста ім выкананы для Дома Урала бюсты Карла Маркса, Фрыдрыха Энгельса, Уладзіміра Ільіча Леніна. Акрамя таго, М. А. Керзіным выканан праект помніка Леніну, эскіз «Шчаслівае юнацтва», эскіз статуі фізкультурніка. На працягу некалькіх год М. А. Керзін працуе над вялікім творам — скульптурным афармленнем фантана на тэму: «Сувязь горада з вёскай». У гэтай рабоце тав. Керзін імкнецца да выяўлення прынцыпаў соцыялістычнага рэалізма ў супроцьлегласць натуралізму і фармалізму. Адначасова з гэтым М. А. Керзін працуе над медальённым барэльефам таварыша Сталіна.

Скульптар З. І. Азгур належыць таксама да групы мастакоў, сваімі творчымі вытокамі звязаных з традыцыямі акадэмізма і класіцызма. На працягу васьмі год тав. Азгур працуе над вобразам Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Ім зроблена шмат бюстаў і эскізаў на тэмы, звязаныя з вобразам таварыша Сталіна. У сучасны момант тав. Азгур працуе над эскізам скульптурнай групы «Ленін і Сталін», які ў далейшым павінен выліцца ў манументальны твор.

Скульптар А. М. Бразэр у сваім творчым развіцці адштурхоўваецца ад навейшых форм заходне-еўрапейскага мастацтва. Пачаўшы сваю творчую дзейнасць як рысавальшчык і жывапісец, А. М. Бразэр хутка перайшоў на скульптуру, якая стала яго асноўнай прафесіяй. На яго жывапісе прыкметна адбіўся ўплыў сезанізма. Рысункі Бразэра выразныя і характэрны лаканічнасцю сродкаў выражэння. Многія яго скульптурныя работы трактаваны ў шырокай жывапіснай манеры. У сваіх творах Бразэр, шляхам смелага рэалістычнага абагульнення, імкнецца да выяўлення ўнутранай экспрэсіі ствараемага ім вобраза. Тав. Бразэрам выкананы статуя тав. Кірава, бюсты Міхоэльса, статуя «Калгасніца». У сучасны момант А. М. Бразэр працуе над фігурай таварыша Сталіна.

А. В. Грубэ з'яўляецца адзіным майстром сярод скульптараў Беларусі, які працуе па дрэву. Раннія работы тав. Грубэ вызначаліся самадаўлеючым манументалізмам з умоўнай фармалістычнай трактоўкай вобраза, што часта ішло ўразрэз з актуальна-палітычнай тэматыкай яго твораў («Чырвонаармеец», «Ударнікі»). Аднак, ужо з 1932 года ў яго творчасці намячаецца пераход да рэалізма. А. В. Грубэ выканан рад помнікаў, сярод якіх вылучаецца помнік таварышу Дзяржынскаму. У плане рэалістычнага мастацтва выканана статуя «Трактарыстка». У сучасны момант А. В. Грубэ працуе над манументальнай фігурай вялікага пролетарскага пісьменніка Максіма Горкага. Адначасова з гэтым мастак працуе над скульптурным пано па дрэву для беларускага павільёна Масельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. Пано складаецца з расліннага арнаменту, спалучаючага ў сабе геральдычныя элементы, узятыя з беларускага дзяржаўнага герба (дубовы ліст, колас, канюшына, з элементамі народнага арнаменту.

В. В. Волкаў — жывапісец з вялікім творчым вопытам, які прайшоў сур'ёзную акадэмічную школу. Аднак, В. В. Волкаў, з'яўляючыся мастаком шырокай мастацкай арыентацыі, не абмяжоўвае свайго мастацтва сухімі акадэмічнымі традыцыямі. Імкнучыся да рэалістычнага вобраза, ён крытычна выкарыстоўвае таксама і другія дасягненні навейшага рэалістычнага жывапісу. В. В. Волкавым выканан цэлы рад партрэтаў пісьменнікаў, грамадскіх дзеячоў, правадыроў (партрэт В. І. Леніна), гістарычных палотнаў («Партызаны» і інш.), твораў на індустрыяльныя тэмы (пано ў Негарэлым).

Я. М. Кругер, жывапісец з вялікім творчым стажам, працуе ў Беларусі з 1895 года. Ім напісана вялікая колькасць партрэтаў культурных і грамадскіх дзеячоў.

Таленавіты жывапісец І. О. Ахрэмчык належыць да пакалення мастакоў, якія атрымалі мастацкую адукацыю за ўмовах совецкай сучаснасці. Тав. Ахрэмчык скончыў ВХУТЕМАС у той перыяд, калі ў гэтай вучэбнай установе некаторымі прафесарамі насаджаліся фармалістычныя навыкі сярод совецкай мастацкай моладзі. Аднак, І. О. Ахрэмчык змог пазбегнуць фармалістычнай руціны і стаць на шлях рэалістычнага мастацтва. У сваёй творчасці Ахрэмчык аддае вялікую ўвагу жывапіснаму майстэрству (часам на школу рысунку) і адначасова сур'ёзна працуе над зместам сваіх твораў. Ім напісан рад партрэтаў пісьменнікаў (напрыклад Кузьмы Чорнага), жывапісных натурмортаў, пейзажаў і эскізаў на тэмы з гісторыі партыі (II з'езд партыі) і грамадзянскай вайны («Уваход Чырвонай Арміі ў Менск»), якія ў далейшым павінны выліцца ў вялікі закончаны твор.

Графікі Б. Е. Малкін і А. Н. Тычына прарабілі вялікую работу ў галіне афармлення беларускай кнігі і кніжнай ілюстрацыі. Б. Е. Малкін, акрамя таго, сур'ёзна працуе над афортам, а ў апошні час і ў тэатры.

Беларускімі мастакамі праароблена вялікая работа па афармленню грамадскіх і ўрадавых будынкаў, як Дом Урада, Дом Чырвонай Арміі ў Менску, Палац піянераў, а таксама выставак, музеяў, народных святаў. У сучасны момант некаторыя з мастакоў уключыліся ў работу па афармленню беларускага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. Аўтарамі прынятага праекта беларускага павільёна з'яўляюцца заслужаны дзеяч мастацтваў Татлін і беларускі мастак Л. Кроль. Скульптар Грубэ выконвае для галоўнага фасада павільёна апісанае вышэй пано на дрэву. Маладыя мастакі Глебаў і Орлоў выканалі дзве скульптурныя групы — «Абарона» і «Лявоніха». Бембель і Рытэр працуюць над эскізамі чатырох фігур: «Калгасніца-звеннявая па ільну», «Калгасніца-свінарка», «Стары калгаснік са снапом высокага ўраджаю», «Трактарыст».

Мастацкія выстаўкі апошніх год сведчаць аб якасным і ідэйна-палітычным росце многіх беларускіх мастакоў. Аднак, нягледзячы на тыя значныя зрухі, якія наглядаюцца ў беларускім мастацтве ў апошнія годы, трэба сказаць, што тое, што ўжо зроблена беларускімі мастакамі, яшчэ далёка не можа задаволіць патрабаванняў, якія прад'яўляе да нас наша грандыёзная эпоха. Рад твораў гаворыць аб тым, што яшчэ не зжыта ў асобных мастакоў небяспека фармалізма і натуралізма

Трэба памятаць, што совецкае мастацтва павінна адпавядаць патрабаванням соцыялістычнага рэалізма і, значыць, быць соцыялістычным па зместу і нацыянальным па форме. Авалоданне метадам соцыялістычнага рэалізма дапаможа нашым мастакам адлюстраваць веліч нашай эпохі ў яркіх мастацкіх вобразах.

У заключэнне варта адзначыць, што побач з развіццём прафесіянальнага мастацтва мы за апошнія годы наглядаем вялікі ўздым самадзейнага выяўленчага мастацтва, якое вылучае ўсё новыя і новыя кадры таленавітых мастакоў.

Нам. рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Г — 4716.